

ЖЫВЫ ЭКСПАНАТ ІВАН МІСКО **5**

КЛОПАТ ПРА ТЫХ, ХТО КЛАПОЦІЦЦА **11**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЛЮТАГА 2022 г. АЎТОРАК № 35 (29657)


## КОРАТКА

- **Сёння можна прыняць удзел у датэрміновым галасаванні на рэферэндуме па праекце Канстытуцыі Беларусі.**
- Сярэдняя зарплата ў Мінскай вобласці ў 2021 годзе склала Br1432.
- **Дадатак «Вандрую без COVID-19» дапоўнілі статусам аб вакцынацыі ў Беларусі.**
- Дыктоўку «Музей пахта» да Міжнароднага дня роднай мовы напісалі ў Гродне.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«Мы не цалкам выкарыстоўваем патэнцыял імпартазамяшчэння, вытворчай кааперацыі, навукі і прыцягнення прыватных інвестараў. Для пошуку новых праектаў раёнам неабходна больш актыўна працаваць з галіновымі міністэрствамі, буйнымі прадпрыемствамі, Акадэміяй навук і бізнесам. Рэзервам росту інвестыцый у асноўны капітал з'яўляецца тэхнічнае пераўзбраенне і мадэрнізацыя прампрадпрыемстваў на новай лічбавай тэхналагічнай аснове для дасягнення ўзроўню прадукцыйнасці працы і заработнай платы, прадугледжаных праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады. У найбліжэйшы час будзе праведзена ацэнка дастатковасці мер па выкананні планаў развіцця дзяржаўнымі прадпрыемствамі на тэрыторыях з насельніцтвам больш як 80 тысяч чалавек, удзяліўшы асаблівую ўвагу праектам па імпартазамяшчэнні. Асноўная задача — забяспечыць апераджальнае развіццё гэтых рэгіёнаў, стварыўшы альтэрнатыву сталіцы і абласным цэнтрам».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «НЯЎЖО ПРОЙДЗЕНЫ ВОПЫТ ТАК НІЧОМУ ЛЮДЗЕЙ І НЕ НАВУЧЫЎ?»

### На цырымоніі ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны кіраўнік краіны казаў аб гістарычнай праўдзе і памяці

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды і сцяг пракуратуры. Ва ўрачыстай абстаноўцы кіраўнік дзяржавы ўручыў ордэны, медалі і падзякі Прэзідэнта пракурорскім работнікам. У прыватнасці, ордэна «За службу Радзіме» III ступені ўдастоены генеральны пракурор Андрэй Швед, ордэна Пашаны — пракурор Гродна Уладзімір Клішын.**




Фота БелТА.

Прэзідэнт падкрэсліў, што невыпадкова для правядзення ўрачыстай цырымоніі была выбрана Зала Перамогі Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — сімвала беларускай дзяржаўнасці. «Тут усё нагадвае аб тым, якой цаной мы захавалі сябе як народ, свае права жыць на гэтай зямлі і адбудоўваць нашу дзяржаву, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Знаходзячыся ў гэтым храме смутку па мільёнах ахвяр і гордасці за пакаленне пераможцаў, я задаюся толькі адным пытаннем: няўжо пройдзены вопыт так нічому людзей і не навучыў?»

«Здавался б, памяць аб тых страшных, параўнальна нядаўніх падзеях зусім свежая. Бо сведкі зверстваў фашыстаў яшчэ сярод нас. І яна, гэта ўсенародная памяць, павінна была б астудзіць запал асобных палітыкаў і дзеячаў. Але што мы бачым? Колькасць і маштабы выклікаў і пагроз не змяншаюцца. У выніку міжнацыянальных і ўнутрынацыянальных войнаў працягваюць гінуць людзі, прытым масава», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён канстатаваў, што сучасныя рэваншысты правакуюць новыя канфлікты. «І каб апраўдаць сябе, з усіх сіл спрабуюць перапісаць гісторыю і забраць Перамогу савецкага народа, а нашчадкаў народа-пераможцы, гэта значыць нас з вамі, назваць агрэсарамі», — дадаў ён.

«Гэтага дапусціць мы не можам», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён запэўніў, што пачатае Генеральнай пракуратурай расследаванне фактаў генацыду і ўстанаўленне канкрэтных асоб, якім удалося пазбегнуць пакарання за забойства мірнага насельніцтва, будзе даведзена да канца. «Гэта пытанне гістарычнай справядлівасці і нашага абавязку перад памяццю больш як тры мільёны чалавек, якія сталі ахвярамі нацызму», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Са шкадаваннем Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пасля праведзенага расследавання Генеральнай пракуратуры колькасць загінулых, закатаваных у час вайны людзей павялічыцца. Бо толькі ў 2021 годзе ў Беларусі ўстанавілі каля 300 месцаў пахаванняў. «Усе вынікі праведзенай работы прадставім сусветнай супольнасці (зразумела, калі да гэтага часу сусветная супольнасць будзе існаваць і захоча даведацца і пачуць факты). Яны стануць напамінам аб тым, што так узмоцнена спрабуюць забыць сучасныя паслядоўнікі фашызму», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

Год гістарычнай памяці



# БЕЗ ПРАВА НА ЗАБЫЦЦЁ

### У Белдзяржмузеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбыўся круглы стол «Генацыд беларускага народа ў гады ВАВ»

**Тэмы падобных мерапрыемстваў, сустрэч дыктуе Год гістарычнай памяці, аб'яўлены кіраўніком дзяржавы, а таксама неабходнасць супрацьстаяць тым нападкам на нашу гісторыю, якія апошнім часам ажыццяўляюцца з боку знешніх палітычных сіл. Аднак пераканаць нашу гістарычную супольнасць, увогуле беларускі народ у альтэрнатыўнай «праўдзе» сёння наўрад ці ў каго атрымаецца. Мы гатовы супрацьстаяць тым, хто выступае за перапісванне гісторыі і фальсіфікацыю падзей, звязаных з перыядам Вялікай Айчыннай вайны. У нас ёсць сур'ёзны аргумент — кожны трэці беларус, страчаны ў гады фашысцкай акупацыі.**

СТАР. 7

Тэхнічнае аснашчэнне

# МАБІЛЬНЫ ДОКТАР

### Перасоўны медыцынскі комплекс пачаў работу ў Брэсцкім раёне

**Медыкі, якія прысвяцілі жыццё рабоце ў сельскай мясцовасці, такое маглі дапусціць хіба толькі ў самых смелых марах. Не раз даводзілася гутарыць са сталымі дактарамі альбо фельчарамі, якія згадвалі, што ў час іх маладосці ў выпадку пільнай патрэбы наведаць хворага па месцы яго жыхарства галоўным транспартам нярэдка станавіўся асабісты веласіпед. Цяпер амбулаторыі ў большасці маюць у распараджэнні машыну, адну на ўвесь участак, на якой доктар выязджае па выкліку альбо на прафілактычны агляд на ФАП.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

# «НЯЎЖО ПРОЙДЗЕНЫ ВОПЫТ ТАК НІЧОМУ ЛЮДЗЕЙ І НЕ НАВУЧЫЎ?»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле яго слоў, беларусы павінны помніць, што не адно дзесяцігоддзе спатрэбілася для аднаўлення даваеннай колькасці насельніцтва краіны. «Дзякуючы неймаверным намаганням і працы беларускага народа наша краіна здабыла сваё непаўторнае сучаснае аблічча», — сказаў Прэзідэнт.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў цырымоніі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сваёй настойлівасцю і прынцыповасцю пры абароне правоў грамадзян, грамадскіх і дзяржаўных інтарэсаў, сумленнасцю і патрыятызмам яны заваявалі немалы аўтарытэт. «У гэтым годзе пракуратура Беларусі адзначыць векавы юбілей. І няхай сцяг як асаблівая рэліквія нагадвае нам аб свяшчэнным абавязку кожнага грамадзяніна — служыць сваёй Айчыне», — заявіў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў прысутных з уручэннем дзяржаўных узнагарод і сцяга пракуратуры, пажадаўшы ім здароўя і дабрабыту, прафесійных поспехаў на карысць роднай краіны і, самае галоўнае, мірнага неба над галавой: «Нам трэба зрабіць усё, каб наша краіна, якая зведала такое гора зусім нядаўна, заставалася мірнай, незалежнай краінай і каб на нашай зямлі жылі толькі мірныя людзі».

У сваю чаргу Генеральны пракурор Андрэй Швед выказаў Прэзідэнту вялікую ўдзячнасць за высокі гонар, які кіраўнік дзяржавы аказаў, уручыўшы сцяг пракуратуры: «Мы абавязуемся шанаваць і берагчы перададзеную нам святыню як сімвал даверу дзяржавы пракурорскай дзейнасці. Запэўніваю вас, што пракурорскія работнікі і ў далейшым будуць на самым высокім узроўні выконваць пастаўленыя задачы». З нагоды памятнай падзеі Андрэй Швед уручыў Аляксандру Лукашэнку нагрудны знак узнагароды «За заслугі» і памятны сувенір — эмблему органаў пракуратуры.

**Паводле БелТА.**

Акцэнты

# ПАМЯЦЬ АБ ВАЙНЕ ПАВІННА ЖЫЦЬ

**На гэта звярнула ўвагу падчас сустрэчы з прадстаўнікамі перспектыўнага кадравага рэзерву Брэсцкага аблвыканкама і моладдзю Брэстчыны Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**

На сустрэчу са спікерам верхняй палаты парламента прыехалі 75 маладых хлопцаў і дзяўчат, якія больш падрабязна даведаліся аб структуры і функцыях Савета Рэспублікі, заканадаўчай і экспертнай рабоце сенатараў.

Наталля Качанава нагадала маладым людзям, што зараз наша краіна знаходзіцца на парозе важнага палітычнага мерапрыемства — рэспубліканскага рэферэндуму па зменах і дапаўненнях у Асноўны Закон краіны, які пройдзе 27 лютага.

Дарэчы, з сённяшняга дня пачалося датэрміновае галасаванне.

Наталля Качанава расказала ўдзельнікам сустрэчы, што шмат прапаноў у абноўлены варыянт Канстытуцыі было накіравана менавіта з Савета Рэспублікі. Адна з актуальных — аднасесійны перыяд работы верхняй палаты парламента з перапынкам толькі на два летнія месяцы.

— Жыццё настолькі дынамічнае і падзеі, якія адбываюцца ў свеце, так хутка змяняюцца, што мы выдатна разумеем: работа над законапраектамі павінна быць такая ж актыўная, эфектыўная і накіраваная на перспектыву — на будучыню, — патлумачыла яна і адзначыла, што гэтая прапанова была падтрымана членамі Канстытуцыйнай камісіі.

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу ўдзельнікаў сустрэчы на тым, што работа сенатараў над законапраектамі распачынаецца на пачатковым этапе распрацоўкі разам з калегамі з Палаты прадстаўнікоў. Гэта дае магчымасць аператыўна прымаць рашэнні, якія актуальныя ў грамадстве.

У якасці прыкладу яна нагадала падзеі 2020-га, калі ў краіне трэба было тэрмінова прымаць законапраекты, якія дазволілі б дзяржаве рэгуляваць і прымаць меры ў адносінах да тых, хто рабіў замах на незалежнасць краіны, яе суверэнітэт, якія дыскрэдытавалі ўладу, прадстаўлялі фэйкавую і лжывую інфармацыю.

— Таму былі ўнесены змены ў Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны, Крымінальна-выканаўчы кодэксы, — нагадала яна.

Акрамя таго, былі прыняты новыя для краіны законапраекты «Аб абароне персанальных даных», «Закон аб недапушчальнасці рэабілітацыі нацызму».

— Гісторыя, якую мы беражліва ахоўваем, традыцыі, якія мы перадаём нашчадкам, — для нас гэта святое! — падкрэсліла яна. — Таму ў Канстытуцыі прапануецца ўзаконіць гэтыя пастулаты і прапісаць, што памяць аб Вялікай Айчыннай вайне не падлягае забыццю і павінна быць абсалютна праўдзівай.

Спікер верхняй палаты парламента таксама нагадала, што не так даўно быў прыняты законапраект «Аб генацыдзе беларускага народа».

— Таму што толькі разумеючы цяжар, які перанеслі старэйшыя пакаленні, можна асэнсоўваць, наколькі важна, што ў тваёй краіне пануюць мір і згода, — звярнула ўвагу Наталля Качанава.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

*Больш інфармацыі пра сустрэчу Старшыні Савета Рэспублікі з перспектыўнай моладдзю Брэстчыны чытайце ў найбліжэйшым нумары дадатку «Мясцовае самакіраванне» за 25 лютага.*

Бяспека

# ПРАВЕРКА СІЛ РЭАГАВАННЯ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ ПРАЦЯГНЕЦЦА

## Аб гэтым, падводзячы вынікі сумеснага беларуска-расійскага вучэння «Саюзная рашучасць — 2022», заявіў міністр абароны

**Віктар ХРЭНІН паведаміў, што ў адпаведнасці з рашэннем кіраўнікоў дзяржаў Генеральныя штабы Узброеных Сіл Беларусі і Расіі выпрацавалі сумесныя далейшыя крокі, якія будуць увасоблены ў жыццё. Перш за ўсё яны накіраваны на недапушчэнне вайны.**



— Складаная ваенна-палітычная абстаноўка складваецца вакол нашай дзяржавы, калі цэнтры ваеннай сілы сышліся ў бескампраміснай барацьбе, — адзначыў кіраўнік абароннага ведамства Беларусі. — Такім невялікім дзяржавам, як Рэспубліка Беларусь, не застаецца нічога іншага, як умацоўваць свае ваенна-палітычныя саюзы, чым мы цяпер і займаемся. Для нас Расійская Федэрацыя з'яўляецца асноўным і самым надзейным стратэгічным саюзнікам. Аналіз абстаноўкі паказвае аб правільнасці прынятых рашэнняў аб правядзенні пазапланавых, так і планавых мерапрыемстваў, у тым ліку правядзення вучэння «Саюзная рашучасць — 2022».

За фінальным розыгрышам практычнага эпізоду ваенных дзеянняў войск, які адбыўся на палігоне «Абуз-Лясноўскі» ў суботу, назіралі высокія госці, военачальнікі, 20 ваенных аташэ з 16 краін, а таксама звыш 120 беларускіх, расійскіх і замежных журналістаў.

— Сумесная групоўка ваеннаслужачых паспяхова справілася з задачамі вучэння, — адзначыў **Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.** — Мы сталі сведкамі зладжаных, упэўненых дзеянняў, дакладнага ўзаемадзеяння групоўкі войск Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, якія павінны забяспечваць задачы па ваеннай бяспецы Саюзнай дзяржавы. З пастаўленымі задачамі нашы ваеннаслужачыя справіліся. Гэта сведчыць аб навучанасці войск, зладжанасці дзеянняў, гэта значыць, што дзесяць дзён вучэння не прайшлі дарэмна.

Як канстатаваў **дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ**, у ходзе вучэння зноў пацверджана адзіная абаронная дактрына аб абароне заходніх рубяжоў Саюзнай дзяржавы. «Мы бачылі асаблівую зладжанасць, дух таварыства і ўзаемавыручкі, якія паказаў асабовы склад Узброеных Сіл Расіі і Беларусі, — падкрэсліў дзяржсакратар. — І прывязваць, і падвёрстваць гэтыя вучэнні да якога-небудзь адказу на ціск Захаду было б, напэўна, няправільна. У Расіі і Беларусі свая самастойная, незалежная, збалансаваная палітыка, якая пацвярджае ў тым ліку абаронны характар гэтых вучэнняў і абаронны характар нашай Ваеннай дактрыны».

Самыя важныя і галоўныя вынікі гэтага вучэння, па словах міністра абароны Беларусі, — мы прадэманстравалі ўсяму свету, што гатовы абараняць, можам выконваць задачы хутка, дакладна, зладжана і ва ўстаноўленыя тэрміны.

Нягледзячы на тое, што вучэнне завяршылася, Віктар Хрэнін заўважыў: абстаноўка на заходніх граніцах з Рэспублікай Беларусь застаецца вельмі цяжкая для прагнозу. «Гэтае вучэнне таксама агаліла тыя нядобрыя задумы, якія ёсць у нашых апанентаў, — падкрэсліў военачальнік. — Іх схаваная цынічнасць бачная, яна на паверхні ўсёй сусветнай грамадскасці. Пад выглядам быццам бы пагрозы нашага вучэння ідзе «накачванне» еўрапейскіх краін, канкрэтна нашых суседзяў, шматлікімі сістэмамі ўзбраення. Мы сёння бачым, што прыбываюць групоўкі войск Злучаных Штатаў у складзе 82-й паветрана-дэсантнай дывізіі. Нам кажуць, што яна не такая ўжо і баяздольная. Напэўна, кіраўнікі наўмысна заніжаюць магчымасці сваіх войск. Аднак мы бачым, што яны прыбылі і з баявымі верталётамі, і з браніраванымі машынамі і ўвогуле дэсантнікі ніколі не могуць быць дрэнна падрыхтаванымі».

Міністр абароны паведаміў, што сёння іх групоўка войск, авіяцыі значна павялічылася ў параўнанні з той колькасцю лятальных апаратаў, якія былі да пачатку вучэння. «На тэрыторыю Польшчы са Злучаных Штатаў перамясціліся самалёты F-35, F-15, F-16, стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі B-52, — расказаў Віктар Хрэнін. — Нам кажуць, што гэта ўсё для абароны, але мы добра разумеем, што нам проста нахабна хлусяць. Нам кажуць, што ў Літве няма танкавага батальёна Злучаных Штатаў, а ён там ёсць. Мы бачым, як удасканальваецца інфраструктура, як ужо падрыхтавана больш чым пяць аэрадромаў, як ствараецца ваенная лагістыка, базы, арсеналы, удасканальваюцца сістэмы кіравання. Гэта не што іншае, як папярэдняя падрыхтоўка да ваенных дзеянняў. Нас гэта не можа не турбаваць, таму мы вымушаны адэкватна рэагаваць, у тым ліку, правёўшы гэтае вучэнне, мы яшчэ раз паказваем — нам ёсць чым адказаць. І на тыя планы, якія выношваюцца ў калідорах заходніх партнёраў аб магчымасці гарачай вайны, якія шукаюць нашы вузкія месцы, праблемы, у нас ёсць дакладны адказ: вузкія месцы надзейна прыкрытыя, і нам ёсць чым адказаць».

Звярнуў увагу кіраўнік абароннага ведамства і на абвастрэнне абстаноўкі ва Украіне, назваўшы тое, што там адбываецца, істэрыяй і нагнятаннем калектыўным Захадам на чале са Злучанымі Штатамі, якія цынічна падштурхоўваюць да вайны паміж Украінай і Расіяй. «Думаю, што сёння і ваенна-палітычнае кіраўніцтва Украіны бачыць усю цынічнасць Захаду, — пераканаы міністр абароны. — Ім на працягу васьмі гадоў расказвалі адно, а робяць іншае. Ёсць імкненне наладзіць дыялог. Мы гатовы да дыялогу з нашым паўднёвым суседам і будзем яго праводзіць. Калі нам хтосьці працягвае руку, мы не б'ём па ёй, а таксама яе працягваем».

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота «Ваяр».**

### На найвышэйшым узроўні

**Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін 19 лютага прынялі ўдзел у трэніроўцы па кіраванні Узброенымі Сіламі Расіі, у час якой прайшло вучэнне сіл стратэгічнага стрымлівання**

Кіраўнікі дзяржаў сачылі за вучэннямі з Сітуацыйнага цэнтра Прэзідэнта Расіі ў Крамлі.

Як далажыў прэзідэнтам міністр абароны Расіі Сяргей Шайгу, у час вучэння адпрацоўваюцца пытанні кіравання ядзернай зброяй і зброяй павышанай патэнцыяльнай небяспекі. Паводле яго слоў, да манеўраў прыцягнуты падраздзяленні Паветрана-касмічных сіл, Паўднёвай ваеннай акругі, Ракетных войскаў стратэгічнага прызначэння, Паўночнага і Чарнаморскага флатоў.

Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расіі Валерый Герасімаў у сваю чаргу далажыў, што асноўная мэта манеўраў — адпрацоўка дзеянняў стратэгічных наступальных сіл па нанясенні гарантаванага паражэння праціўніку.

У час вучэння былі зроблены пускі гіпергукавых ракет авіяцыйнага ракетнага комплексу «Кінжал» і гіпергукавых процікарабельных крылатых ракет «Цыркон». Задачы, прадугледжаныя ў час правядзення вучэння сіл стратэгічнага стрымлівання, выкананы ў поўным аб'ёме, усе ракеты паразілі назначаныя цэлі, пацвердзіўшы зададзеныя характарыстыкі.

# АЦЭНКА — СТАНОЎЧАЯ

## У Лагойску назіральнікі ад СНД наведалі ўчасткі для галасавання

**На Лагойшчыне адкрыты 33 участкі для галасавання, у тым ліку два месяцца ў раённых бальніцах і адзін — у доме-інтэрнаце для інвалідаў і састарэлых. Гэтыя тры ўчасткі будуць прымаць выбаршчыкаў менавіта ў дзень галасавання, 27 лютага.**



Упершыню сёлета на тэрыторыі раёна прыйдуць галасаваць 298 юнакоў і дзяўчат, якім споўнілася 18 гадоў. А ўсяго ў спісы для галасавання на рэферэндуме ўнесена больш як 28 тысяч чалавек. Сачыць за ходам галасавання будуць 285 назіральнікаў, якія прайшлі акрэдытацыю. Гэта прадстаўнікі працоўных калектываў і грамадскіх арганізацый, а таксама дэпутаты. Прадстаўнікоў місіі міжнародных назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў цікавіла, як праходзілі выбары ў мінулыя гады, якая была яўка і якая чакаецца падчас гэтага рэферэндуму, з якім настроем прыходзілі людзі, як будуць паступаць члены камісіі ў выпадку спрэчных сітуацый, якія меры будуць прыняты, каб абараніць усіх ад ковіду.

— Што датычыцца спрэчак, то ў камісіях працуюць вопытныя і адказныя людзі, якія змогуць папярэдзіць непаразуменні, — лічыць **старшыня раённай выбарчай камісіі Дзмітрый ШЧУРЭВІЧ.** — Як сведчыць вопыт мінулых гадоў, людзі прыходзяць для галасавання актыўна, часта цэлымі сем'ямі. Прычым прыводзяць з сабой дзяцей, каб тыя выраслі патрыётамі сваёй краіны, галасавалі так, як іх бацькі. Цікава будзе дарослым і малым паглядзець выступленні самадзейных артыстаў, розныя дзіцячыя выставы, што разгорнуцца на ўчастках.

Участак для галасавання № 6 знаходзіцца ў будынку РУП «Лагойскі камгас». Тут ён адкрыўся ўпершыню. Раней месціўся ў мясцовым ДТСААФ.

На ўваходных дзвярах змешчаны лістоўкі, якія нагадваюць пра асноўны дзень галасавання. Але тым, каму не атрымаецца гэтага зрабіць 27 лютага, можна аддаць свой голас на датэрміновым галасаванні, якое пачнецца з 22 лютага.

Памяшканне для галасавання прасторнае, светлае. Адразу відаць, што тут нядаўна зроблены рамонт. Для работы камісіі і назіральнікаў створаны камфортныя ўмовы — сталы, крэслы. На стале — таблічкі з назвамі вуліц, каб выбаршчыкам было зручна знайсці свой адрас.

Людзі прыходзяць, цікавяцца, як будзе праходзіць рэферэндум, калі можна будзе прагаласаваць, якія дакументы неабходна прынесці.

**Старшыня ўчастковай выбарчай камісіі Аляксандр ГРАЧЫХА** дае падрабязныя адказы на ўсе пытанні. Аляксандр Пятровіч удзельнічае ў выбарчым працэсе ўжо трэці раз, так што вопыту яму не займаць.

— Можаце прагаласаваць датэрмінова або ў асноўны дзень кампаніі 27 лютага, — тлумачыць ён пажылой жанчыне. — Можаце зарэгістравацца па любым дакуменце. Галоўнае, каб у ім быў ваш асабісты фотаздымак. А можаце выклікаць членаў камісіі на дом, глядзіце, як вам зручна.

У пакоі абсталяваны дзве кабіны для галасавання без пярэдніх шторак для таго, каб пры праветрыванні свежае паветра даходзіла і туды. Гэта вельмі важна пры пандэміі каранавіруса.

— Але калі нехта не згодны з гэтым і запатрабуе запаўняць бюлетэнь за занавескай, то, вядома, пойдзем яму насустрач: слова выбаршчыка для нас закон, — удакладняе суразмоўнік.

Практычна пасярэдзіне залы змешчаны тры празрыстыя скрыні для галасавання, адна з іх пазначана чырвоным колерам — для датэрміновага.

— Здараецца так, што за выбарамі мы забываем пра членаў камісій, — заўважылі назіральнікі ад СНД. — Як вы паклапоціцеся аб іх?

— У нас ёсць бытавы пакой, дзе харчуюцца нашы работнікі.



Тут ёсць усё неабходнае абсталяванне: мікрахвалеўка, халадзільнік. Падчас рэферэндуму ён таксама будзе адкрыты, тут можна перакусіць, — адказвае Аляксандр Пятровіч. — Назіраць за выбарамі будзе пяць чалавек, для іх мы склалі графік, каб таксама змаглі па чарзе адпачыць. У спісы выбаршчыкаў унесена 1337 чалавек, у асноўным — жыхары прыватнага сектара. Сярод выбаршчыкаў ёсць адзін інвалід, па заяўцы сваякоў мы выедзем са скрыняй да яго дадому.

А наогул, для тых, хто дрэнна бачыць, падрыхтавана лупа. Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ўладкаваны пандус. Пры неабходнасці састарэлым і нямоглым будуць дапамагаць валанцёры. Моладзі, якая ўпершыню прыйдзе на ўчасткі, уручаць падарункі, сувеніры, каб гэты дзень ім надоўга запомніўся. Ну, і, вядома, будзе працаваць буфет, дзе можна выпіць кавы або гарбаты, а дзяцей пачаставаць салодкай смакатой.

— Нас азнаёмілі з ходам падрыхтоўкі да рэферэндуму, далі магчымасць пабываць на месцах у Лагойскім раёне. Убачанае сведчыць, што падрыхтоўка ідзе належным чынам, адпавядае нацыянальнаму заканадаўству і міжнародным нормам. Мы звярталі ўвагу на многія аспекты. Гэта і фарміраванне спісаў выбаршчыкаў, выбарчых камісій, захаванне санітарных нормаў, якія рэкамендавала Цэнтральная выбарчая камісія, — сказаў назіральнік Манучэхр Ахмад Хаджызада.

Госць дадаў, што місія міжнародных назіральнікаў ад СНД сфарміравана 1 лютага, знаходзіцца ў Мінску ў выканкаме штаб-кватэры СНД. Яны актыўна ўдзельнічаюць у назіранні за выбарчым працэсам, ужо пабывалі ва ўсіх абласцях Беларусі. І далі станоўчую ацэнку ходу падрыхтоўкі да рэферэндуму.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# У РЭЖЫМЕ ПРАЎДЫ

## У Мінску прайшоў фінал аднайменнага рэспубліканскага праекта

**Рэспубліканскі праект «У рэжыме праўды» праходзіць напярэдадні рэферэндуму па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, яго мэта — разбурэнне фэйкаў і негатыўных стэрэатыпаў, створаных вакол Беларусі. Падчас серыі публічных выступленняў у розных рэгіёнах краіны працавала група прафесійных экспертаў. Сярод спікераў — яркія палітыкі, публіцысты і грамадскія дзеячы, у тым ліку члены Канстытуцыйнай камісіі. Пры гэтым выкарыстоўваліся новыя формы і метады работы з аўдыторыяй. Фінальная акцыя прайшла ў Палацы спорту ў Мінску.**



Напярэдадні правядзення фіналу **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ** адзначыў:

— Мы прадставім нашы аўтарскія тэлевізійныя праекты. Мы назвалі гэтую сустрэчу «Прамы кантакт». І якраз нашы журналісты, нашы аўтары выйдуць на прамы кантакт з аўдыторыяй. Можна будзе пагутарыць, выказаць свой пункт гледжання. Спадзяюся, атрымаецца цікава і пазнавальна.

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА**, які таксама прысутнічаў на мерапрыемстве, адзначыў: «Я звярнуў увагу, з якой цікавасцю сюды ідуць людзі самых розных пакаленняў. Больш за ўсё маладых людзей. Напэўна, у цяжкія перыяды гісторыі патрыятызм прачынаецца ў найлепшых чалавечых якасцях, як гэта было ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у пасляваенны перыяд».

Спікеры, звяртаючыся да гледачоў, казалі аб неабходнасці ўдзелу ў рэферэндуме і запрашалі адкрыта адстойваць сваю грамадзянскую пазіцыю. **Старшыня праўлення беларускага таварыства «Веды» Вадзім ГІГІН** падкрэсліў:

— Мы ўбачылі, як людзі адстойвалі свае пазіцыі па тых ці іншых артыкулах Канстытуцыі: пагаджаліся, спрачаліся, знаходзілі кампрамісы. Гэта вельмі важна. І зараз, у Палацы спорту, у гэтым гістарычным месцы, мы хочам падзяліцца сваімі поглядамі і данесці іх пры дапамозе сучасных сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі.

Падчас правядзення фіналу праекта спікеры закранулі і іншыя тэмы, якія сёлета актыўна абмяркоўваюцца ў інфармацыйнай прасторы: Год гістарычнай памяці, абвастрэнне сітуацыі на Данбасе, а таксама амаль вырашанае пытанне з бежанцамі. Прагучаў і галоўны прынцып палітыкі сучаснай Беларусі: мы мірная краіна, якая выступае супраць ваенных дзеянняў.

Мерапрыемства ў Палацы спорту складалася не толькі з выступленняў журналістаў і блогераў, але і з музычна-танцавальных нумароў. Вядучыя запрашалі гледачоў не саромецца і танцаваць разам. А напрыканцы фіналу «У рэжыме праўды» прагучаў беларускі гімн у выкананні ўсіх удзельнікаў праекта.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота БелТА.**

Да адказнасці

# «КУРАТАРЫ З-ЗА МЯЖЫ ЎСТАНОЎЛЕНЫЯ»

**Затрымана каля 10 каардынатараў і выканаўцаў зрыву рэферэндуму ў Беларусі. Аб гэтым заявіў у эфіры АНТ начальнік аддзела інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Цэнтральнага апарату Следчага камітэта Сяргей КАБАКОВІЧ, паведамляе БелТА.**

«У Следчы камітэт з Камітэта дзяржаўнай бяспекі паступілі матэрыялы па факце ўчынення групай асоб экстрэмісцкіх дзеянняў, якія праявіліся ў спробе аказаць незаконнае ўздзеянне на членаў выбарчых камісій», — расказаў Сяргей Кабаковіч.

Паводле яго слоў, матэрыялам дадзена прававая ацэнка. «Узбуджана крымінальная справа. На гэты час затрымана каля 10 каардынатараў і выканаўцаў з розных рэгіёнаў краіны. Расследаванне крымінальнай справы працягваецца», — адзначыў начальнік аддзела.

Як паведамлялася, Камітэт дзяржаўнай бяспекі Беларусі раскрыў групы, якія пад кіраўніцтвам замежных куратараў планавалі зрыў канстытуцыйнага рэферэндуму. Людзі, якія атрымлівалі ўказанні з-за мяжы, заклікалі псаваць бюлетэні, запалохваць членаў выбарчых камісій і пагражаць ім. У пісьмах, што яны адпраўлялі ад імя міліцыянераў і суддзяў, — адкрытыя пагрозы і ўказанне на тое, што вядомы іх адрасы. Куратары з-за мяжы ўстаноўлены, каардынатары і радавыя выканаўцы ў Беларусі затрыманы.

**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY**

# МАБІЛЬНЫ ДОКТАР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цяпер тэхнічнае аснашчэнне сельскай медыцыны ўдасканальваецца, у сувязі з чым можна гаварыць, што галіна выходзіць на новы ўзровень. Як паведаміла **афіцыйны прадстаўнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама Тацяна ГАПОНІК**, у канцы мінулага года аблвыканкам выдзеліў дадатковыя бюджэтныя сродкі для закупкі трох сучасных медыцынскіх перасоўных комплексаў. Яны пастаўлены ў Баранавіцкі, Пінскі і Брэсцкі раёны для паляпшэння якасці медыцынскіх паслуг і, галоўнае, іх даступнасці жыхарам нават самых аддаленых вёсак. На такой машыне цяпер медыцынская брыгада перыядычна накіроўваецца ў глыбінку.




Перасоўны медыцынскі комплекс з'яўляецца амбулаторна-паліклінічным, ён прадугледжаны для правядзення прафілактычных медыцынскіх аглядаў, дыспансерызацыі насельніцтва, а таксама планавай медыцынскай дапамогі. Медработнікі тут праводзяць розныя медыцынскія ўмяшанні, дыягностыку, лабараторныя даследаванні, а яшчэ робяць прышчэпкі, праводзяць тлумачальную і асветніцкую работу.

Некаторыя населеныя пункты размешчаны даволі далёка ад амбулаторый, і шраг людзей, асабліва пажылых, слабых, адзінокіх не могуць своечасова дабрацца да доктара, каб хоць раз на год прайсці кваліфікаваны медыцынскі агляд. Асобныя ж сельскія жыхары прызнаваліся медыкам, што проста баяліся падчас пандэміі лішні раз падвяргаць сябе рызыцы і не пайшлі на прыём да ўрача. А тут спецыялісты прыязджаюць на месца жыхарства.

У ліку першых адрасоў выезду перасоўнага медыцынскага комплексу ў Брэсцкім раёне была вёска Малыя Зводы. Названы населены пункт уваходзіць у зону абслугоўвання Лышчыцкай участковай бальніцы. Яе **загадчыца Тацяна КУЛЕШ** вельмі высока ацэньвае магчымасці новай медыцынскай машыны:

— Унутры машыны размяшчаецца некалькі міні-кабінетаў, дзе можа прымаць пацыентаў урач агульнай практыкі альбо вузкі спецыяліст, ёсць магчымасць зрабіць электракардыяграму, правесці забор крыві на аналізы, а таксама пацыенткі могуць прайсці агляд акушэра-гінеколага. Гэтым разам у Малых Зводах вяскоўцаў прымаў урач агульнай практыкі Дзмітрый Шумак. На прыём прыйшлі 20 чалавек розных узростаў, усе яны пасля агляду атрымалі рэкамендацыі па лячэнні і прафілактыцы. Здаць аналізы змаглі 17 чалавек, адзінаццаць жанчын былі агледжаны акушэркай Раісай Пашкевіч.

— Такія выезды мы рыхтуем загадзя, — працягвала Тацяна Сцяпанаўна. — Аб прыездзе медыкаў людзі ведалі за тыдзень, іх праінфармавалі сельвыканкам і староста вёскі. Чакаць прыёму яны маглі ў клубе, цяпер надвор'е не спрыяе таму, каб доўгі час знаходзіцца на вуліцы. Далей будзем вырашаць гэтае пытанне разам з мясцовай уладай. Ёсць вёскі, дзе не засталося ніводнай грамадскай установы. Там, можа, напрыклад, старасты арганізуюць месцы для чакання ў некага дома.

— Паводле папярэдняй інфармацыі, мы зможам карыстацца гэтым комплексам прыкладна раз на месяц. Хацелася б, вядома, каб там з'явіўся апарат УГД і іншыя прыстасаванні для дыягностыкі. З часам спадзяёмся арганізаваць выезды ўрачоў вузкіх спецыяльнасцей. Нашым, асабліва пажылым, пацыентам не лішні агляд неўролага, хірурга альбо спецыяліста іншага профілю. Думаю, што гэта неўзабаве стане магчыма. А пакуль людзі былі задаволены работай мабільнай брыгады, бо мы чулі ў свой адрас толькі словы падзякі, — падсумавала доктар Кулеш.

Добрыя водгукі атрымалі і медыкі Цюхініцкай сельскай амбулаторыі, якія выязджалі ў вёску Ставішча. Тут пацыентаў прымаў урач агульнай практыкі Сяргей Красевіч, яму дапамагалі медсястра Валянціна Вакульчык і лабарант Алена Казлоўская. Некаторыя пацыенты пажадалі здаць тэст на ковід, і такая паслуга была аказана. Асабліва актыўна ішлі на прыём пажылыя пенсіянеры. Некаму трэба было памераць ціск, зрабіць кардыяграму, іншыя хацелі даведацца ўзровень цукру ў крыві. І ўсё гэта аказалася магчымым ажыццявіць побач з домам, без наведвання медыцынскай установы.

Паводле слоў **галоўнага ўрача Брэсцкай гарадской бальніцы № 2 Яўгена КАПЫЛЬЦА**, з дапамогай такіх медыцынскіх комплексаў стане магчыма зрабіць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу больш даступнай для жыхароў аддаленых вёсак. Стаіць задача максімальна ахапіць дыспансерызацыяй насельніцтва раёна. Таму перасоўная амбулаторыя будзе курсіраваць па графіку ў розныя населеныя пункты.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота абласнога ўпраўлення аховы здароўя,**

*Брэсцкі раён.*

Надвор'е

# АДЛІГА ЗАХАВАЕЦЦА ДА КАНЦА ЛЮТАГА

## Уначы слабы мінус, а ўдзень ужо ўпэўнены плюс

**На тэрыторыі нашай краіны будзе працягвацца даволі ветранае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А досыць моцныя вятры прынёс нам яшчэ на мінулым тыдні магутны цыклон, якому нямецкія метэаролагі далі назву ZEYNEP. Ён праявіўся ў многіх раёнах узмацненнем ветру ў начныя гадзіны парывамі 15—18 м/с, раніцай і ўдзень да 15—24 м/с. Па Гродзенскай, Брэсцкай і Мінскай абласцях яго парывы дасягнулі 25—27 м/с. Акрамя парывістага ветру, воблачнасці і ападкаў атлантычныя цыклоны прыносяць на тэрыторыю нашай краіны цёплыя паветраныя масы, якія прыпагвяюць падтрымліваць тэмпературны рэжым у рамках вясновых значэнняў.



У аўторак чакаецца чарговая сістэма атмасферных франтоў ад атлантычнага цыклона ANTONIA, які ссоўваецца з акваторыі Балтыйскага мора на Пскоўскую вобласць Расіі. Прагназуецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Удзень у многіх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўднёва-заходні, заходні парывісты, на большай частцы тэрыторыі парывы ветру будуць дасягаць 15—20 м/с (аранжавы ўзровень небяспекі). Максімальная тэмпература паветра будзе 1—7 цяпла, па паўднёвым усходзе краіны — да плюс 9 градусаў.

У сераду Беларусь апынецца ў вобласці паніжанага атмасфернага ціску, у дзённыя гадзіны па паўднёвым захадзе краіны адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту, які ссоўваецца з Заходняй Еўропы. Месцамі па краіне будзе адзначацца кароткачасовы снег, мокры снег, удзень па паўднёвым захадзе краіны ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, раніцай прагназуецца слабы галалёд. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 2 — мінус 7 градусаў. Удзень будзе вагацца ад мінус 2 градусаў па паўночным усходзе да плюс 5 па паўднёвым захадзе краіны.

Амаль вясновае надвор'е чакае нас у чацвер. У гэты дзень яшчэ адаб'ецца ўплыў адыходзячага на тэрыторыю Украіны атмасфернага фронту. Таму ўначы і раніцай месцамі па краіне, а па паўднёвым захадзе ў многіх раёнах будуць кароткачасовы снег, мокры снег, слабыя туман і галалёд. У дзённыя гадзіны ініцыятыва ў надвор'і пяройдзе да вобласці павышанага атмасфернага ціску, у сувязі з гэтым істотных ападкаў па краіне не прагназуецца. На асобных участках дарог яшчэ будзе захоўвацца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да плюс 1 цяпла, па паўночным усходзе краіны ў цёмны час сутак падмарозіць да мінус 6—8 градусаў. У разгар дня лютаўскае сонца прагрэе паветра ад нуля да 7 градусаў з плюсам.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## З Данбаса ў Расію прыбыла 61 тысяча бежанцаў

**Выконваючы абавязкі кіраўніка МНС Расіі Аляксандр Чупрыян заявіў, што з самаабвешчаных ЛНР і ДНР прыбылі ў Расію каля 61 тысячы бежанцаў, паведамляе ТАСС.**



Чупрыян дадаў, што за мінулыя суткі з Растоўскай вобласці ў іншыя рэгіёны краіны былі накіраваны дзевяць пасажырскіх цягнікоў з бежанцамі.

У пятніцу, 18 лютага, кіраўнікі ЛНР і ДНР Леанід Пасечнік і Дзяніс Пушылін на фоне ўзрослай пагрозы баявых дзеянняў аб'явілі аб эвакуацыі жыхароў рэспублік у Расію, першапачаткова ў Растоўскую вобласць. Пазней яшчэ шэраг расійскіх рэгіёнаў паведамілі аб гатоўнасці прыняць і размясціць бежанцаў. У сувязі з прыбыццём бежанцаў рэжым НС быў уведзены ў Пензенскай, Варонежскай, Саратаўскай і Растоўскай абласцях.

## СААЗ: завяршэнне пандэміі можа быць абвешчана да канца 2022 года

**Пандэмія каранавіруса можа падысці да канца ў гэтым годзе. Існуе верагоднасць, што пасля хвалі «амікрону» ў свеце не будзе вялікіх усплёскаў заражэнняў. Пра гэта заявіла ў інтэрв'ю ТАСС спецыяльны прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Расіі Меліта Вуйновіч.**

«Цяпер цяжка прагназаваць, але мы спадзяёмся, што калі нічога іншага не здарыцца, то пандэмія можа падысці да канца ў 2022 годзе, — адзначыла яна. — Што значыць канец пандэміі? Гэта значыць, што не будзе вялікіх усплёскаў новых выпадкаў, але не азначае, што вірус сыдзе. Цяперашняя вялікая колькасць заражаных азначае, што вірус мае магчымасць муціраваць, так што мы не ведаем, як будзе развівацца сітуацыя. Але ёсць асцярожны аптымізм, што буйныя ўсплёскі скончацца, калі «амікрон» абыдзе ўвесь зямны шар».

Паводле слоў Вуйновіч, СААЗ спрабуе спрагназаваць, калі гэта адбудзецца, але ўзнікаюць цяжкасці з прычыны таго, што дзяржавы зараз мяняюць свае стратэгіі па тэсціраванні. Так, растлумачыла яна, амікрон-штам вельмі заразны і хутка распаўсюджваецца, а некаторыя краіны не маюць фінансавай і іншых магчымасцяў, каб тэсціраваць кожнага з улікам вялікай колькасці бессімптомных заражэнняў.

Амікрон-штам каранавіруса здольны выклікаць цяжкае цячэнне захворвання, таму ўразлівым групам насельніцтва неабходна вакцынавацца, заявіла Меліта Вуйновіч.

## Страты Украіны на фоне распаўсюджвання інфармацыі аб «уварванні» складаюць $2-3 млрд у месяц

**Беззваротныя страты Украіны на фоне распаўсюджвання інфармацыі аб «уварванні» складаюць $2-3 млрд у месяц. Пра гэта ў інтэрв'ю «РБК-Украіна» заявіў намеснік кіраўніка Офіса прэзідэнта Украіны Расціслаў Шурма.**

«Мы бачым, што незваротныя страты складаюць у такой стрэсавай сітуацыі, як цяпер, $2-3 млрд у месяц. Гэта і спыненыя інвестыцыі, і дадатковая інфляцыя, страты ў турыстычнай сферы, скарачэнне авіяперавозак. Ёсць яшчэ спекулятыўны ціск на фінансавыя рынкі, які блакіруе запазычанні, ціснe на курс. Гэта асобная сума. Спекулятыўны ціск на валютны рынак — каля $1,5-2 млрд», — паведаміў Расціслаў Шурма.

Паводле яго слоў, цяпер Украіне неабходна $ 4-5 млрд, каб рэалізаваць дзяржаўныя праграмы, якія былі раней запланаваны. «Зразумела, усе ставяць праекты на паўзу. Не адмяняюць, але адкладаюць рашэнні. І знешнія крэдытныя рынкі часова закрытыя», — расказаў Расціслаў Шурма.

# «КАЛІ Я ФАРМУЮ, КАЛІ ЛЯПЛЮ — МЯНЕ НІЧОГА БОЛЬШ НЕ ЦІКАВІЦЬ»

## Народнаму мастаку Беларусі Івану Міско — 90

**У Мінску, у самым цэнтры старога горада, на вуліцы Інтэрнацыянальнай, ёсць незвычайны дом... У ім пабачыце і музей, куды прыходзяць зацікаўленыя наведвальнікі, і мастацкую майстэрню, дзе ўвесь час віруе праца, і самога Майстра, «жывы экспанат» — так жартам называе сябе народны мастак Беларусі Іван Якімавіч МІСКО. Яго майстэрня-музей, частка Музея гісторыі Мінска, мае і яшчэ адно вымярэнне — касмічнае... Скульптар, чый шлях пачаўся 90 гадоў таму на хутары Чамяры Слонімскага раёна, шмат гадоў лепіць касманаўтаў і ўвогуле займаецца касмічнай тэмай... Сюды неадночы тэлефанавалі проста з арбіты, а тыя, хто там пабываў, прыходзяць і ў якасці мадэляў, і як сябры. *«Нас і нашу працу Вы прапусцілі праз трапяткое сэрца мастака, а напрацаванымі рукамі стварылі вобразы і справы сучаснікаў»* — гэта водгук аднаго з такіх гасцей, касманаўта Пятра Клімука.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

І сёння, у свой пачэсны юбілей, Іван Якімавіч не спыняе працы і нават знаходзіць, чым здзівіць:

— У мяне новая тэма — іншапланецяне.

***— Нічога сабе! Вы ж, здаецца, даволі скептычна да гэтага ставіліся, бо нiводны з вашых касмічных сяброў не прызнаўся, што сустракаў незямное жыццё...***

— Што гэтая тэма для мяне? Яна свабодная. Яе ніхто мне не заказваў, магчыма, яна нікому і не патрэбная. Але гэта волевыяўленне маё. Я ў гэтай тэме адпачываю, у мяне з'яўляюцца кожны дзень новыя думкі і ідэі. Тры работы я ўжо зрабіў, адліў формы. Але нікому не паказваю. Таму што баюся, што мяне могуць пацягнуць у іншы бок. А каму спадабаецца, каму не спадабаецца, абсалютна не цікавіць. У дзевяноста гадоў я магу дазволіць сабе ляпіць тое, што мне хочацца.

***— Гэта будзе цэлы цыкл?***

— Сем-дзесяць работ. І нават «Міс Іншапланецянка», касмічная жаночая прыгажосць. Калі касманаўт Алег Навіцкі апошні раз быў у мяне ў майстэрні, я яго папрасіў: «Калі паўз ілюмінатар будзе пралятаць ці пастукаецца іншапланецянка, ты ёй адчыні, павітайся, запомні, якая яна, і мы з табой яе вылепім».

***— Іншапланецяне ў вашым уяўленні антрапаморфныя ці зусім не падобныя да чалавека?***

— Не хачу гаварыць. Няхай застаецца сакрэт да адкрыцця выставы. Я ж цяпер, падчас юбілейнага святкавання ў ратушы, толькі фотаздымкі маіх работ падрыхтаваў. Мы зараз нашым аўтарскім калектывам, з Сяргеем Логвінам і Уладзімірам Піпіным, заканчваем помнік Якубу Коласу для Стоўбцаў, гэта адымае ўвесь час. А персанальную выставу пастараюся зрабіць да Дня касманаўтыкі, калі паспею. Вось там і цыкл пра іншапланецян выстаўлю... А яшчэ пакажу свае малюнкі. І ўпершыню выстаўлю маскі. Мне сказалі, што да кожнай маскі павінна быць напісана яе гісторыя. Тым больш у мяне маскі не пасмяротныя, яны ўсе знімаліся з жывых людзей. Розніца вельмі вялікая.

***— Цікава, а як вы адбіралі выявы сваіх работ, як вызначалі этапныя?***

— Яны мне ўсе дарагія. У кожным узросце — свае этапныя, бо іншае ўспрымане. Папрасі мастака праілюстраваць адзін і той жа твор у розных узростах — атрымаеце зусім розныя малюнкі. Галоўнае — заўсёды, на кожным этапе быць паглынутым працай. Калі я фармую, калі ляплю — мяне нічога больш не цікавіць, таму што я рукамі і вачыма ўвесь там. Брудны ці не, альбо ўвесь у гіпсе... А калі ты нічога не робіш, ляжыш і фантазіруеш — вось, на стале абвалілася тынкоўка, што ж там намалявалася? Блёкат...

***— Ну, чаму блёкат? Яшчэ Леанарда да Вінчы раіў разглядаць плямы плесні на сценах і расколіны, уяўляць, на што яны падобныя, і натхняцца.***

— Для таго каб брацца натхненне, сядзець у чатырох сценках нельга. Няхай ты і звышгеніяльны. Гэта мусіць быць назапашванне ўражанняў за шмат гадоў у розных сітуацыях. Нам даручылі рабіць помнік Максіму Горкаму ў парку яго імя. Эскіз зацвердзілі. І аднойчы я еxaў ад камвольнага камбіната на тралейбусе, і праз пярэднія дзверы ўвайшоў мужчына, высокага росту, скуласты, трошкі прыгорблены. Ён павярнуўся ў профіль, і я ўбачыў: жывы Максім Горкі! Я сядзеў і думаў: падысці, не падысці? Жывая натура — гэта ж якая радасць! Які матэрыял для помніка! А храбрасці не было. Ён праз два прыпынкі выйшаў. Я пасля кожны дзень ездзіў па гэтым маршруце ў спадзяванні, што ён увойдзе, сябе дакараў: трэба быць больш смелым. Па сённяшні таму той тыпаж, які мы згубілі.

***— Значыць, калі падумаць, у помніках мы часта бачым выявы не гістарычных асоб, а натуршчыкаў?***

— Так! У мастацкім вучылішчы ў нас быў натуршчык лысаваты, невысокі... Ён спецыялізаваўся на пазіраванні для выяў Леніна. Калі б Ленін паглядзеў на выставу Ленініяны, ці знайшоў бы ўласны партрэт? Памятаю, калі нас сабралі ў Прыбалтыцы на семінар «Вобраз Леніна ў манументальнай скульптуры», мы пыталіся ў мясцовых скульптараў: «Чаму ў вашых Ленінаў такая тоўстая шыя, магутная фактура?» Адказ: «Таму што Ленін — змагар за мір». Акцёр Бабачкін сыграў у фільме ролю Чапаева... І колькі мы ляпілі Чапаева, ніхто не карыстаўся фатаграфіямі Чапаева, збіралі фотаздымкі Бабачкіна, яго ляпілі...

***— А ў вашай іншапланецянкі ёсць правобраз?***

— Мне гэтая ідэя падабаецца, бо іншапланецянку кожны можа ўявіць сваю. У кожнага свой ідэал жанчыны. Памятаю, вярнуўся з арміі, мяне залічылі ў мастацкае вучылішча. І вось першы раз у жыцці я малюю аголеную жаночую натуру. Ды ўпершыню і бачыў аголеную жаночую мадэль. Перапынак. Усе пайшлі курыць. Натуршчыца падышла да мяне. «Скажыце, вы першы раз аголеную натуру малюеце?» — «Так». — «Я па вашых вачах бачу. Дык калі трэба, я магу прыйсці ў суботу ці нядзелю, каб вы памалявалі, таму што вы ў малюнку адсталі». Я спалохаўся. Адмовіўся. Такі вось быў... А калі вучыўся на чацвёртым курсе, жыў на кватэры па вуліцы Чырвонаармейскай, у падвале, у пакоі з трыма дзяўчатамі. Малады прыгожы салдат, у вайсковай форме (грамадзянскага адзення ў мяне ўвогуле не было). І дзяўчаты ўвесь час гадалі, з кім жа з іх Іван можа ажаніцца. Глядзелі за мной, есці варылі... Спалі не распранаючыся, каб мяне не бянтэжыць. Працавалі яны на заводзе. І аднойчы я прыйшоў у пакой з адной знаёмай дзяўчынкай са Слоніма, яна паступіла ў медінстытут. Гаспадыня гэта ўбачыла, распавяла дзяўчатам. Дзяўчаты сказалі: «Усё, сам мый адзенне, сам вары есці». З таго дня з'явілася поўная абыякавасць да мяне. Вось як аўтарытэт страціў...

***— І часта здаралася, што творчую фантазію разбурала жорсткая рэальнасць?***

— Калі я вёў дзіцячую студыю, даў дзецям заданне: дома ўявіце, што прыляцелі на іншую планету... А пасля намалюеце ці вылепіце, з кім вы сустракаліся, што бачылі, што елі... Яны выканалі. Тады кажу: «А цяпер уявіце, што вы запрасілі іншапланецян да сябе, няхай яны паглядзяць, як вы жывяце. Падумайце, чым бы вы хацелі іх пачаставаць». Адна дзяўчынка ўстае: «Я іх пачастую макаронаю». Я пытаюся, чаму. «А ў нас дома больш ежы ніякай няма». Мне стала дрэнна... Я дзяцей уцягнуў у фантазію. А дзяўчынцы няма чаго есці. Дзеці — і найлепшыя фантазёры, і самыя дапытлівыя. Я ў дзяцінстве ўсё хацеў сам спазнаць. Неяк маці прыйшла з горада і бацьку кажа: «Якім, нешта мне вельмі сэрца баліць». А я, малы, выскачыў на вуліцу і як пачаў сябе ў грудзі кулаком біць... Хацеў зразумець, што адчувае маці. Тая пабачыла праз акно: «Якім, паглядзі, які Ванька дурны, зараз сябе заб'е!» А я ёй кажу: «Усё адно не баліць мне сэрца...» Сёння разумею, як яно баліць. Яшчэ залазіў на дах, на дрэва — куды сонца сядае? А, за лесам... Заўтра схаджу... Пайшоў — а там яшчэ адзін лес! Дарэчы, вось учора ўзяў кардонку і намаляваў усход сонца — касмічны.

***— Ці захаваўся сёння ваш хутар?***

— Захаваўся. Але ў доме жывуць іншыя людзі...

***— А чаму б у такім выпадку хоць шыльду не зрабіць? Каб турысты ездзілі, глядзелі, дзе нарадзіўся мастак вырас, чым натхняўся. Яшчэ адзін турыстычны аб'ект будзе...***

— Добрая ідэя! Мы імкнёмся паехаць некуды за мяжу, а сваёй Беларусі не ведаем! Якія розныя тыпажы, песні, стравы традыцыйныя... Прыехаў я ў Брэсцкую вобласць, у Моталь. І вось мясцовыя загаварылі... Я слухаю — не разумею, бо яны на сваім мясцовым паляшуцкім дыялекце... І мне так спадабалася. Як гэта прыгожа!

***— Вашы мадэлі часта ўмешваюцца ў вашу працу?***

— У кожнага свае пажаданні. Памятаю, Кавалёнак быў незадаволены, што я вылепіў яго ў касмічным скафандры: ён хацеў быць у парадна форме, з узнагародамі, пагонамі... Але потым ацаніў. А вось эскіз мемарыяльнай дошкі для школы, дзе Алег Навіцкі вучыўся. Тут будзе тэкст: «У нашай школе вучыўся лётчык-касманаўт, Герой Расіі, які здзейсніў тры касмічныя палёты, Алег Навіцкі». Алег паглядзеў на мяне: «Іван Якімавіч, а чаму тры?». Я кажу: «Як будзе чацвёрты, зрэжам бронзавыя літары і падставім слова «чатыры». Але сёння не магу выканаць гэтую работу, усё ўпіраецца ў сродкі. А вось новая кампазіцыя «На старт»: Алег Навіцкі крочыць у касцюме касманаўта. Алег прыйшоў з жонкай, паглядзеў... Не, кажа, гэта не тая дарога, якая вядзе нас у космас. Тая дарога не пакрытая пліткамі, гэта цяжкі шлях з рознымі перашкодамі... І шлях той у кампазіцыі трэба падоўжыць. Бо прайсці ўсе мараць — не кожнаму ўдаецца пераадолець. Мару зрабіць такі помнік, можа, на радзіме Навіцкага...

***— У Год гістарычнай памяці будзе шмат новых праектаў... Што вы прапануеце на гэтую тэму?***

— Помнік удовам Вялікай Айчыннай вайны. Тэма Дня народнага адзінства важная... Я ж сам памятаю 1939 год, як у верасні збіраў яблыкі і частаваў на шашы на Гродна савецкіх танкістаў... Яшчэ ў мяне даўно зроблена скульптура Казіміра Семяновіча, беларуса, заснавальніка мастацтва артылерыі... Чаму дасюль не можам усталяваць? Што такое гістарычная памяць? Яна не можа адлюстроўвацца фармальна. Памятаю, на наш мастацкі савет са Старых Дарог прадставілі праект мемарыяльнага знака ў памяць вайсковай часці, якая на пачатку Вялікай Айчыннай вайны трапіла там у акружэнне і загінула. Камень, на ім гранітная дошчачка... Савет забракаваў, старадарожцы пакрыўдзіліся... Я сказаў: «Мы з сябрамі савета прыедзем да вас у музей, паглядзім матэрыялы». За гэты час там правялі раскопкі на месцы баёў, знайшлі шмат вінтовак, штыкоў, касак, усё ржавае, з адзнакай вайны... Я кажу: калі гэта пабачыў — вось жа ён, помнік! Не закопваць гісторыю, а даставаць з зямлі! Усе гэтыя артэфакты сталі часткай помніка, які цяпер у Старых Дарогах ганарацца. Яшчэ тэма, якая мне дарагая, — упарадкаванне крыніц Беларусі. Кавалёнак мне казаў: «Калі перад палётам ты не прыехаў на радзіму Гагарына і не папіў вады з яго крыніцы, не паляціш». Гэта рытуал... Цяпер ёсць дарučэнне, каб на радзіме Алега Навіцкага знайсці крыніцу, аздобіць яе, як зроблена на радзіме Гагарына. І будзе ў нас крыніца Алега Навіцкага. Ён заслужыў — мала хто так любіць свае родныя мясціны, так аддадзены ім...

***— Вы столькі ляпілі знакамітых беларусаў... А які ён, тыповы беларус?***

— Шмат было такіх тыпажоў, той жа Алег Навіцкі. А яшчэ прыгадваецца, як рабіў бюст Героя Сацыялістычнай Працы, старшыні саўгаса, былога партызана Уладзіміра Ралько. Пасля адкрыцця бюста ў Пінску пытаюся ў Ралько: я, маляў, рыбак, дзе тут у вас рыбкі палавіць?.. Ён паклікаў сваіх людзей: «Вось гэтага інтэлігента адвязіце, хай ён парыбачыць». Павезлі. Нейкія лугі, балоты, берагі, зараслыя асакой, дабрацца цяжка. Мы ледзь не паўзком, паўраспранутыя, залезлі ў тую грязь і кошыкамі лавілі рыбку... Маладзенькія шчучкі. Шмат налавілі... Потым выбраліся з гразі, памыліся... І замест беласкурых сталі ўсе акрываўленыя. Мы ад радасці, што рыбы шмат, не заўважылі, як усе асакой парэзаліся. Пасля Ралько пытаецца: «Ну як, інтэлігент?» Кажу: «Вельмі смачная рыба, надоўга запомніцца». А калі ляпіў бюст Ралько, так уявіў вобраз старшыні саўгаса: швэдар, абветраны твар... Вылепіў яго ў швэдары. Ён прыехаў, паглядзеў эскіз: «Я ж ніколі швэдар не насіў, што ж ты, сукін сын, робіш!» Перарабіў, вылепіў яго ў кашулі, з гальштукам. Прыехаў. «Я ж ніколі гальштукаў не насіў. Які я інтэлігент, я ж калгаснік!». Расказаў: калі яго Машэраў запрашаў на прыём, заўсёды перад тым, як зайсці да яго ў кабінет, ішоў у прыбіральню, даставаў гальштук, павязваў. А потым, як выходзіў з кабінета, здымаў — і ў кішэню! І вось пакуль ён расказваў, я рукамі ўчапіўся ў гліняны гальштук на бюсце і вырваў і каўнер раскрыў... Ралько кажа: «Вось, гэта я!»

***— Здзіўляе, колькі ўвас ідэй, колькі працуеце...***

— Думаеш: як гэта пражыў столькі гадоў? Хочацца зрабіць штосьці новае, са сваім новым, іншым поглядам, творчым досведам. Каб у мяне было шмат памочнікаў, кожнаму даў бы заданне, дзень і ноч працавалі б. Дамоў прыходжу, павячэраю — і малюю. Я ж набыў мальберт, шмат фарбаў... Захапіўся жывапісам. Кожны дзень кладуся ў тры гадзіны ночы. Я ж паступаў на жывапіснае аддзяленне. А потым пабачыў, што ёсць скульптурнае, думаю, там лепей, я ж мужык, я павінен да твора дакрануцца, абняць... А што на той плоскасці? І сышоў з жывапіснага. А зараз чамусьці мяне пацягнула зноў да жывапісу. Я атрымліваю такую асалоду... Адчыняю акно — які прыгожы дзень сёння! Якая колеравая гама! Як лекі для мяне.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Общепит «Школьник», Брестская обл., г. Барановичи, ул. Красноармейская, 4** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Месторасположение:**
**Брестская обл., г. Барановичи, пер. Советский 4-й, д. 3**

| Наименование (назначение) | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб., снижена на 10 % | Шаг торгов, бел. руб. |
|---|---|---|
| **Гараж** (здание специализированное автомобильного транспорта), общ. пл. 26,4 кв. м, инв. № 110/С-93439 | 10 476,00 | 523,80 |

**Сведения о земельном участке**: пл. 0,0031 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания гаража

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты продавца за проведение независимой оценки и затраты организатора торгов на их проведение, а также оплатить установленное вознаграждение **10 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона несутся покупателем

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Извещение о предыдущих электронных торгах опубликовано в газете «Звязда» 10.06.2021 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 10.03.2022 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по **09.03.2022 до 17.00**

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ООО «ВОСТОКИНВЕСТ», Минская обл., г. Солигорск, ул. Железнодорожная, 12А, оф. 306** |

**Предмет аукциона**

**Торговый центр**.
Наименование: изолированное помещение, назначение: помещение многофункциональное. Общ. пл. **2 169,2 кв. м**, инв. № **644/D-47731**, адрес: Минская обл., г. Солигорск, ул. Железнодорожная, 12А-2. Ограничения / обременения: аренда

**Начальная цена: 1 626 000 долларов США (без НДС).**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на р/с BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней с даты проведения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:**
оплата победителем электронных торгов (единственным участником электронных торгов, давшим согласие на приобретение имущества по цене, увеличенной на 5 %) осуществляется в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты.
Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи предмета электронных торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 18.12.2021

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 16.03.2022 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 14.03.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные организатора аукциона** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

# ОАО «Амкодор-Белвар»

*220005, г. Минск, проспект Независимости, 58*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА

**Собрание состоится 28 марта 2022 г. в 14.00 по адресу: 220005, г. Минск, проспект Независимости, 58, зал заседания Общества**

Орган, созывающий собрание акционеров, – Совет директоров ОАО «Амкодор-Белвар».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 13.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участии в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия.

При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

**Повестка дня**

1. Утверждение количественного и персонального состава счетной комиссии.
2. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2021 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2022 год.
3. Заключение Ревизионной комиссии общества по результатам проведенной ревизии деятельности общества за 2021 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2021 год.
5. Распределение прибыли и убытков по итогам работы общества за 2021 год.
6. Избрание членов Совета директоров общества.
7. Избрание Ревизионной комиссии общества.
8. Определение размера вознаграждений членам Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 07 марта 2022 года, а с иной информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 21 марта 2022 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в отделе кадров ОАО «Амкодор-Белвар» (220005, г. Минск, проспект Независимости, 58) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

**Совет директоров ОАО «Амкодор-Белвар».**

УНП 100363840

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 440/С-9547 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 146,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Борунская, 36 с пожарной сигнализацией ППК А6-06.**

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424950100001002033, площадью 0,0408 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: г. Ошмяны, ул. Борунская, 36. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,0408 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0002 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, код – 5.5, площадью 0,0015 га

Начальная цена продажи – 61 350 руб. (шестьдесят одна тысяча триста пятьдесят рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 6 135 руб. (шесть тысяч сто тридцать пять рублей)

**Продавец – Ошмянский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 130, тел. 8-01593-76-705**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 208, тел. 55-87-71**

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833 225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 16 марта 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.06.2021 г.

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 11 марта 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion**

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов по продаже имущества ОАО «Трест Белстромремонт» в форме открытого аукциона

| № Лота | Наименование предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. (10 %) | Шаг аукциона, бел. руб. (5 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Резчик швов HCC20A-CH с двиг. хонда ENGINE, инв. № 720 | 336,00 | 33,60 | 16,80 |
| 2 | Прибор для резки плитки 630 мм (ролик 22 мм) шт. 268.20, инв. № 77755 | 57,60 | 5,76 | 2,88 |
| 3 | Вибротрамбовка RAM-70HD C/W инв. № 712 | 408,00 | 40,80 | 20,40 |
| 4 | Водонагреватель проточный эл. ЭПВН-7,5 кВт 220В, инв. № 770 | 36,00 | 3,60 | 1,80 |
| 5 | Веерная щитовая опалубка колонн системы Н=3,3м (с частичным крепежом) | 2 040,00 | 204,00 | 102,00 |
| 6 | Вагон-бытовка (инв. № 14) | 672,00 | 67,20 | 33,60 |
| 7 | Вагон-бытовка (инв. № 724) | 792,00 | 79,20 | 39,60 |
| 8 | Вагон-бытовка (инв. № 418) + печь отопительно-варочная НОРМАЛЬ-2 | 1 041,60 | 104,16 | 52,08 |
| 9 | Вагон-бытовка (инв. № 423) + печь отопительно-варочная НОРМАЛЬ-2 | 2 481,60 | 124,08 | 248,16 |
| 10 | Форд скорпио 88-59 | 924,00 | 92,40 | 46,20 |
| 11 | Фуговальный станок (инв. 467); Долбежный станок (инв. 408); Станок заточной (инв. 510) | 1 788,00 | 178,80 | 89,40 |
| 12 | Стол каменщика (5 шт.) | 720,00 | 72,00 | 36,00 |
| 13 | Лист профилированный (101,10 кв. м) | 1 091,88 | 109,19 | 54,59 |

В отношении лотов 1–7 проводятся седьмые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 80 %.** Публикация об аукционе ранее размещалась в газете «Звязда» 07.08.2020. В отношении лотов 8–9 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 40 %.** Публикация об аукционе ранее размещалась в газете «Звязда» 07.08.2020. В отношении лотов 10–13 проводятся первые торги

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения открытого аукциона** | По лотам 1–9: **14 марта 2022 года в 14.00 (регистрация с 15.30 до 15.55)** По лотам 10–13: **25 марта 2022 года в 14.00 (регистрация с 15.30 до 15.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127 |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | По лотам 1–9: с 10.00 22.02.2022 по 16.00 10.03.2022 По лотам 10–13: с 10.00 22.02.2022 по 16.00 23.03.2022 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Местонахождение имущества** | г. Гродно, ул. Дубко, д. 11 |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA301 22215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «Трест Белстромремонт», проводимых ___.___.2022.
2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. Вознаграждение аукциониста – 7,5 % от конечной цены предмета торгов.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **Контактное лицо для осмотра объекта торгов: +375295894134 Ольга Михайловна.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **Открытое акционерное общество «Трест Белстромремонт» (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», +375 29 304 59 90)** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт: orgtorg.by 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, офис 1127** |

Утерянные Свидетельство о госрегистрации № 01-003, печати и Устав общественного объединения Столинского еврейского культурно-просветительского общественного объединения «Мост», зарегистрированное Брестским облисполкомом 06.10.1999 г. **считать недействительными**.

УНП 200713612

Утерянные пропуска УО «БГАТУ» на имя МИЛЯК Владислав Николаевич и ВАНЮШИН Никита Юрьевич **считать недействительными.**

# БЕЗ ПРАВА НА ЗАБЫЦЦЁ

## Грыф «сакрэтна» зняты

Нягледзячы на тое, што пасля заканчэння вайны прайшло ўжо немала часу, у гэтым пытанні яшчэ шмат белых плям. Аб чым сведчаць і новыя факты, звязаныя са знішчэннем мірнага насельніцтва Беларусі, выяўленыя Генеральнай пракуратурай у ходзе расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа. У сваю чаргу, за апошнія гады Нацыянальным архівам падрыхтаваны шэраг зборнікаў дакументаў, якія доўгі час былі засакрэчаны. Шырокі рэзананс ужо атрымала шасцітомнае выданне серыі «Без тэрміну даўнасці», у якім расказваецца аб злачынствах нацыстаў і іх памагатых у адносінах да мірнага насельніцтва Беларусі. Кожнай вобласці нашай краіны прысвечаны асобны том. Чатыры ўжо выйшлі, завяршаецца работа над апошнімі двума.


Валерый НАДТАЧАЕЎ (мадэратар круглага стала).


Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.

— У гэтых публікацыях мы не маглі абысці тэму Халакосту, — адзначыў **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.** — У савецкі час пры яе асвятленні пераважаў інтэрнацыяналізм. Цяпер мы, наадварот, кажучы аб ахвярах вайны, вельмі шмат увагі пачалі ўдзяляць нацыянальным момантам. Павінна быць разумная прапорцыя ў гэтых адносінах. Самае галоўнае — пацярпелі людзі. І сёння няправільна высвятляць, хто больш: беларусы ці яўрэі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Навуковы супрацоўнік аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Мар'яна ТУМАШ**, якая працавала над зборнікамі серыі «Без тэрміну даўнасці. Беларусь: злачынствы нацыстаў і іх памагатых супраць мірнага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны», дастаткова працяглы час вывучае дукументы, звязаныя з Другой сусветнай вайной, і, здавалася, сутыкалася ўжо са многім, аднак, працуючы над гэтым праектам, зразумела, што да некаторых рэчаў немагчыма прывыкнуць.

— Зборнік унікальны тым, што дадаткі да яго па зваёй значнасці і нават па аб'ёме не саступаюць дакументальнай частцы, — заявіла архівіст. — Гэта інтэлектуальны прадукт, які ў многім дапамагае разабрацца ў саміх дакументах. Першы дадатак — спіс месцаў прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі кожнай вобласці, другі — спіс месцаў масавага знішчэння яўрэяў на акупаванай тэрыторыі. У трэцім дадатку прыводзіцца пералік найбольш буйных карных аперацый на тэрыторыі канкрэтнага рэгіёна, у чацвёртым — спіс спаленых вёсак, знішчаных у гады Вялікай Айчыннай вайны. Работа працягваецца, яшчэ шмат белых плям, якія з часам можна будзе закрыць.

Паралельна Нацыянальны архіў заканчвае падрыхтоўку зборніка дакументаў «Трагедыя і памяць. Знішчэнне яўрэяў на тэрыторыі акупаванай Беларусі», у які ўвайшло 520 дакументаў. Большасць з іх вядомыя. У асноўным гэта акты Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі. Цікавыя дакументы архівісты атрымалі ў Цэнтральным архіве камітэта дзяржаўнай бяспекі — крымінальныя справы на замежных ваеннапалонных, якіх асудзілі ў пасляваенны перыяд за здзяйсненне ваенных злачынстваў і злачынстваў, якія яны здзейснілі ў лагерах.

Як заўважыў Вячаслаў Селяменеў, задача архівістаў — паказаць, хто знішчаў яўрэяў у Беларусі ў гады вайны. «У Германіі дагэтуль спрабуюць сцвярджаць, што вермахт не прыкладваў руку да злачынстваў, — удакладніў кандыдат гістарычных навук. — Маўляў, займаліся толькі ваеннымі дзеяннямі, а ў тых карных акцыях яны не прымалі ўдзелу. Дакументы, якія мы апублікавалі ў зборніку «Сведчаць каты», пацвярджаюць, што і вермахт быў актыўным удзельнікам знішчэння яўрэяў у Беларусі, акрамя карных органаў, паліцыі, паліцыі бяспекі СД, СС. Тут мы ўпершыню пачалі публікаваць дакументы былых нямецкіх ваеннаслужачых падраздзяленняў вермахта, карных органаў аб расстрэле яўрэяў у Беларусі. Іншая частка дакументаў па Халакосце датычыцца тэмы ўвекавечвання памяці яўрэяў. Ніколі дагэтуль яна ў такім ключы — менавіта публікацыя дакументаў — не разглядалася».

У той жа час Вячаслаў Селяменеў звярнуў увагу на тое, што, нягледзячы на даступнасць дакументаў па тэме Вялікай Айчыннай вайны, якія ўжо амаль поўнасцю рассакрэчаны, цікавасці да вывучэння праблематыкі ў навуковай супольнасці няма. «Фашысты спалілі ў Беларусі больш чым дзевяць тысяч вёсак, а дагэтуль няма ні аднаго спецыяльнага навуковага даследавання, — канстатаваў гісторык. — Нацысты правялі звыш 140 буйных карных аперацый — няма ні аднаго навуковага спецыяльнага даследавання. Па генацыдзе беларускага народа апошняя публікацыя датуецца 1984 годам. Генеральнай пракуратуры, якая расследуе справу аб генацыдзе беларускага народа, сёння патрэбны ўсе лічбы, а яны ў нас на ўзроўні 1969 года — тое, што ў свой час зрабіў Інстытут гісторыі партыі. Сёння ў нас з'явілася безліч новых крыніц, працы для даследчыкаў — непачаты край».

## Генацыд — з першых дзён вайны

Гістарычная супольнасць аднагалосна сцвярджае: тое, што сёння выдаецца ў Нацыянальным архіве, — аснова для будучых навуковых прац.

— Улічваючы той факт, што сёння вядзецца следства па справе аб генацыдзе, гэтая тэма мае актуальнае значэнне, і да яе сапраўды неабходна павярнуцца зусім іншым бокам, не так, як гэта было раней, — адзначыў **загадчык цэнтра ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Аляксей ЛІТВІН.** — Ужо 30 гадоў мы знаходзімся ў зусім іншай сістэме каардынат, і тыя падыходы, якія, здавалася, ужо ўстанавіліся, па многіх параметрах разваліліся. І гэта датычыцца не толькі гісторыі Другой сусветнай вайны, але і ўсёй гісторыі Расіі і Беларусі. Яшчэ ў пачатку 90-х гадоў я казаў, што вядзецца атака па пэўных гістарычных квадратах.


Аляксей ЛІТВІН.

На думку доктара гістарычных навук, прафесара, у вывучэнні праблемы генацыду беларускага народа ў савецкай гістарыяграфіі быў абраны правільны кірунак. «Заслуга беларускай гістарыяграфіі, нашых вучоных у тым, што ў нас гэтая тэма пастаянна была ў полі зроку, — паведаміў Аляксей Літвін. — Да 1960-х гадоў у навуковым, шырокім плане, вядома, яна не даследавалася. Штуршком стала стварэнне мемарыяльнага комплексу ў Хатыні. Тады намаганнямі Інстытута гісторыі, Інстытута гісторыі партыі ЦК КПБ, перад якім была пастаўлена гэтая задача, раённых камітэтаў партыі, сельскіх Саветаў быў упершыню складзены спіс спаленых вёсак. Ён, вядома, няпоўны, і каб удасканаліць яго, сёння патрэбна дзяржаўная праграма».

Як лічыць загадчык цэнтра ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін, вельмі важна глыбока ўсведамляць факт, што ажыццяўленне злачынных гітлераўскіх планаў генацыду ў адносінах да савецкіх людзей пачалося з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны. «Гэта не было рэакцыяй на партызанскія дзеянні, — падкрэсліў гісторык. — Калі немцы акупавалі Польшчу, іншыя краіны, нічога падобнага не назіралася. Ажыццяўленне палітыкі генацыду ў адносінах да савецкага народа і спецыяльнымі органамі, і Вермахтам пачалося ўжо з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны. Пад маркай ваенных і палітычных праціўнікаў расстрэльвалі і прадстаўнікоў яўрэйскага насельніцтва».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# У ВІЦЕБСКУ ПРАЦУЕ ВЫСТАЎКА АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НАЦЫСТАЎ У ГАДЫ ВАЙНЫ

**У Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза Міная Шмырова працуе выстаўка «Злачынствы нацыстаў і іх памагатых на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны», паведамілі БелТА ва ўпраўленні культуры аблвыканкама.**

Віцебская вобласць была цалкам захоплена гітлераўцамі ў ліпені 1941 года — акупацыя працягвалася да ліпеня 1944-га. У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі вобласці была створана сістэма турмаў і канцэнтрацыйных лагераў. У Віцебску і яго наваколлях у перыяд акупацыі існавала пяць буйных лагераў. Самы вялікі з іх быў створаны ў верасні 1941 года як лагер для ваеннапалонных Stalag 313. Тут фашысты знішчылі больш за 80 тысяч ваеннапалонных і цывільнага насельніцтва.

Стаўленне акупантаў да беларусаў было вызначана ў плане «Ост». У адпаведнасці з ім прадугледжвалася фізічна знішчыць ці выселіць 75 % рускіх, беларусаў, украінцаў, а 25 % анямечыць і ператварыць фактычна ў рабоў. Яўрэі падлягалі пагалоўнаму знішчэнню. «Нацысцкія забойцы, ажыццяўляючы злачынную палітыку генацыду, са страшнай сілай абрынулі крывавы тэрор на савецкіх грамадзян. За гады акупацыі ў рэгіёне было праведзена больш за 40 толькі буйных карных аперацый. Карнікі бязлітасна знішчалі вёскі, пакідаючы пасля сябе мёртвую зону. 243 вёскі спальваліся двойчы, 83 — тройчы, 22 — чатыры разы і больш. Нараўне з карнымі аперацыямі фашысты праводзілі лакальныя акцыі па пакаранні насельніцтва за падтрымку партызан, невыкананне распараджэнняў акупацыйных улад.

Пра гэтыя жахі расказвае выстава ў музеі Шмырова. У экспазіцыі ёсць звесткі аб генацыдзе мірнага насельніцтва Беларусі і савецкіх ваеннапалонных, копіі дакументаў, фатаграфіі злачынстваў нацысцкіх акупантаў і раскопак на месцах масавага знішчэння людзей. На размешчаную ў музеі карту нанесена інфармацыя аб колькасці загінулых у лагерах мірных жыхароў з указаннем раёнаў. Прадстаўлены і многія іншыя прадметы, якія праліваюць святло на трагедыю XX стагоддзя.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь панесла вялізныя людскія страты, загінуў кожны трэці яе жыхар. У гарадах і сельскай мясцовасці Віцебшчыны загінула больш за 150 тысяч чалавек, сагнана ў нямецкае рабства — 68 434. У Віцебску, які налічваў да пачатку вайны каля 200 тысяч насельніцтва, у дзень вызвалення засталося ўсяго 118 мірных жыхароў.

# Дзяржархіў Гомельскай вобласці перадаў больш за дзве тысячы дакументаў для расследавання справы аб генацыдзе

**Больш за дзве тысячы дакументаў перадаў Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці для расследавання справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, паведаміў дырэктар архіва Андрэй СУШЧЭВІЧ, перадае карэспандэнт БелТА.**

Па словах Андрэя Сушчэвіча, ва ўстанову паступіў 21 запыт па гэтай тэматыцы. «Мы прадставілі пракуратуры больш як дзве тысячы дакументаў на папяровых і электронных носьбітах. Работа працягваецца», — сказаў ён.

Работнікі пракуратуры апрацоўваюць матэрыялы, якія датычацца фільтрацыйных спраў. «Гэта больш як 30 тысяч такіх спраў. Па выніках апрацоўкі дакументаў будуць дадзены дадатковыя доказы па генацыдзе, эксплуатацыі беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны», — падкрэсліў Андрэй Сушчэвіч.

Частка дакументаў абласнога дзяржархіва ўвайшла ў экспазіцыю выставы «Бывайце, людзі...». Факты аб злачынствах нацыстаў у акупаваным Гомелі», якая адкрылася днямі ў палацы Румянцавых і Паскевічаў. У яе аснове — сапраўдныя дакументы, фатаграфіі і рэчавыя доказы, якія выкрываюць палітыку генацыду, арганізаванага нацыстамі ў акупаваным Гомелі. Экспанаты — дакладныя сведчанні нацысцкага тэрору ў адносінах да мірнага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных.

Наведвальнікі ўбачаць матэрыялы, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Гомельскай вобласці, Дзяржаўным архіве грамадскіх аб'яднанняў рэгіёна, пракуратуры вобласці, у музейным зборы палацава-паркавага ансамбля і прыватнай калекцыі гомельскага гісторыка Юрыя Панкова. Пра зверствы гітлераўцаў у перыяд акупацыі Гомеля сведчаць акты Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, успаміны відавочцаў, паказанні памагатых фашысцкіх злачынцаў, дакументы, фатаграфіі і рэчавыя доказы з месцаў расстрэлаў і масавых пахаванняў ахвяр гітлераўскага тэрору.

# МАЛАДОСЦЬ, ПАМНОЖАНАЯ НА ВОПЫТ

## Хто прадставіць Беларусь на Паралімпійскіх гульнях у Пекіне

**Падзеі Алімпійскіх гульняў у Пекіне свет будзе аналізаваць і ўспамінаць яшчэ доўга. Аднак спартыўныя жарсці ў кітайскай сталіцы не заканчваюцца. Эстафету галоўных стартаў чатырохгоддзя пераймаюць XIII зімовыя Паралімпійскія гульні, якія пачнуцца 4 сакавіка. У праграму Гульняў уключана шэсць відаў спорту: лыжныя гонкі, біятлон, горныя лыжы, снаўборд, хакей на санях і кёрлінг на калясках. За медалі будуць змагацца спартсмены з 39 краін свету. Беларусы традыцыйна выступаюць у лыжных гонках і біятлоне. Дарэчы, менавіта ў гэтых відах спорту заяўлена найбольшая колькасць спартсменаў.**

На мінулых Паралімпійскіх гульнях у Пхёнчхане беларускія спартсмены заваявалі 12 медалёў. Сёлета на галоўныя старты едзе 12 спартсменаў. Можна, канешне, шукаць у гэтым пэўную магію лічбаў. Але куды лепш пазнаёміцца з беларускай камандай і шчыра яе падтрымліваць. **Генеральны сакратар Нацыянальнага паралімпійскага камітэта Беларусі Мікалай ШУДЗЕЙКА** расказаў, як каманда рыхтуецца да галоўнага старту.

«У нас зноў у камандзе — сплаў маладосці і вопыту. За апошні цыкл падрасла добрая моладзь. Мы разлічваем, што яшчэ праз адзін паралімпійскі цыкл яны памужнеюць у прамым і пераносным сэнсах, падужэюць, набяруцца спаборніцкага вопыту. У камандзе ёсць спартсмены, якім па 17 гадоў, і ім зараз трэба набрацца практыкі. А калі яны ўдасканаляць сваё спартыўнае майстэрства, то змогуць скласці моцную канкурэнцыю вядучым спартсменам. Аснову нашай каманды на Гульні ў Пекіне склалі спартсмены, якія выступалі на папярэдніх паралімпіядах, вопытныя і моцныя людзі», — адзначае Мікалай Мікалаевіч.



Святлана САХАНЕНКА.

### ПАЦВЕРДЗІЦЬ МАЙСТЭРСТВА

У 2018 годзе ў Пхёнчхане Лідзія Графеева заваявала два бронзавыя медалі ў біятлонных гонках на 12,5 і 6 кіламетраў. А Дзмітрый Лобан стаў сярэбраным прызёрам Паралімпіяды ў біятлоне і ў лыжных гонках. За чатыры гады адбылося многае. Лідзія Графеева змяніла прозвішча на Лобан, разам з Дзмітрыем яны сталі бацькамі. Нязменным засталося адно — спартыўнае жыццё гэтай сям'і.

Дзмітрый і Лідзія страцілі ногі ў аварыях: Лідзія — у аўтамабільнай, Дзмітрый — у чыгуначнай. Пазнаёміліся ў пратэзнаартапедычным аднаўленчым цэнтры, дзе спартсмены з нацыянальнай каманды якраз праводзілі збор. Дзмітрый на той час ужо быў бронзавым прызёрам Паралімпійскіх гульняў у Ванкуверы. А Лідзія толькі пачынала сваё знаёмства са спортам. А цяпер яны разам імкнуцца да спартыўных вяршынь.

«Дзіма з Лідай будуць удзельнічаць у трох біятлонных і адной лыжнай гонках. Яны малайцы, трэніруюцца, дзіця выхоўваюць — усё паспяваюць. Дай бог, каб на галоўным старце ўсё атрымалася. Дзякуючы вопыту і навыкам яны павінны выступіць нядрэнна», — падкрэслівае генеральны сакратар Паралімпійскага камітэта.

Мікалай Шудзейка адзначае, што за апошнія некалькі стартаў добры прагрэс паказала Валянціна Шыц. На чэмпіянаце свету па зімовых відах спорту сярод інвалідаў яна заваявала два сярэбраныя і два бронзавыя медалі. І гэта ў дадатак да ўзнагарод з папярэдніх міжнародных стартаў. Дарэчы, са сваім трэнерам Юрыем Буранавым спартсменка працуе з дзяцінства. За плячыма ў яе ўдзел у Паралімпійскіх гульнях 2014 і 2018 гадоў. Прыйшоў час пакараць кітайскія Гульні.

У Пекіне выступіць легенда паралімпійскага біятлона Васіль Шапцябой. Гэта цяжка ўявіць, але Паралімпійскія гульні ў Пекіне стануць дзявятымі ў кар'еры Васіля. Прычым выступаў ён як на зімовых, так і на летніх Гульнях. Яго медальны шлях пачаўся ў 2000 годзе на Паралімпіядзе ў



Юрый ГОЛУБ.

Сіднеі, дзе ён стаў бронзавым прызёрам у лёгкай атлетыцы, выступаючы ў эстафеце 4х400. Затым былі летнія Гульні ў Афінах, дзе Васіль стаў двухразовым паралімпійскім чэмпіёнам у веласіпедным спорце. Ён удзельнічаў у спаборніцтвах па веласпорце і ў 2012 годзе ў Лондане, але тады застаўся без медалёў.

Першае выступленне Васіля Шапцябоя на зімовай Паралімпіядзе адбылося ў 2006 годзе ў Турыне, адкуль ён прывёз «бронзу» і «серабро» ў лыжных гонках. На наступных Гульнях у 2010 годзе ў Ванкуверы ён стаў двухразовым бронзавым прызёрам у лыжных гонках і біятлоне. Паралімпіяда 2014 ў Сочы прынесла спартсмену два бронзавыя медалі ў біятлоне. На жаль, за два дні да першай гонкі ў Пхёнчхане Васіль Шапцябой прастудзіўся, што негатыўна паўплывала на яго выступленне.

«Вопыту ў Васіля хапае. І ён разлічвае, што пры добрай стральбе, без штрафных кругоў і дадатковых хвілін атрымаецца вартае выступленне. І мы разлічваем на яго вопыт і ўменне збірацца ў самы адказны момант. Ён ведае, што такое галоўныя старты, і ўмее на іх выступаць», — рэзюмуе Мікалай Шудзейка.

Да галоўных стартаў рыхтуюцца знакамітыя спартсмены Святлана Саханенка і Юрый Голуб. Святлана Саханенка — трохразовая чэмпіёнка Паралімпійскіх гульняў у Пхёнчхане. Яна не пакінула ніякіх шанцаў саперніцам у спаборніцтвах па лыжных гонках. І як бонус заваявала «бронзу» ў біятлоне. Спортам Святлана займаецца ўсё жыццё, вялікія надзеі падавала ў юніёрскім узросце. Але зрок, які стаў імкліва падаць, зачыніў перад ёй дзверы ў алімпійскі спорт і адкрыў у паралімпійскі. Цікавы факт: у паралімпійскую зборную Святлану ўключылі за год да Паралімпіяды. А да Гульняў яна рыхтавалася ўсяго 11 месяцаў. І паказала



Лідзія і Дзмітрый ЛОБАНЫ.

такі вынік! Што ж можа быць у Пекіне пасля чатырох гадоў падрыхтоўкі!?

Юрый Голуб на нядаўнім чэмпіянаце свету заваяваў два залатыя медалі і адзін бронзавы. На Паралімпійскіх гульнях у Пхёнчхане ў спаборніцтвах па біятлоне ён заваяваў два медалі — «золата» ў забегу на 12,5 км і «серабро» на 7,5 км. А ў лыжных гонках стаў сярэбраным і бронзавым прызёрам. Выдатнае дасягненне, асабліва калі прыняць да ўвагі, што сур'ёзна паралімпійскім спортам Юрый стаў займацца толькі ў 2015 годзе. Цяпер вопыту і сілы больш, а значыць, і мацнейшая вера ў поспех.

На чэмпіянаце свету беларуская каманда ў складзе Аркадзя Шыкуця, Святланы Саханенкі, Валянціны Шыц і Мікіты Ладзесава стала бронзавым прызёрам у змешанай лыжнай эстафеце. Напярэдадні Паралімпійскіх гульняў Аркадзь Шыкуць засяродзіўся на біятлонных спаборніцтвах. У асабістых гонках прагрэсіруе і Мікіта Ладзесаў. Яго Мікалай Шудзейка называе незаменным чалавекам і ў эстафеце.

### ПАЧАЦЬ СПАРТЫЎНЫ ШЛЯХ

Прыклад спартсменаў старэйшага пакалення абавязкова стане добрай матывацыяй для маладых атлетаў. На свае першыя Гульні едзе 17-гадовы Раман Свірыдзенка. «У Ромы спецыфічная катэгорыя інваліднасці. І па прычыне фізіялагічных асаблівасцяў ён можа бегчы на лыжах толькі класічным стылем. Ён добрая дапамога для эстафетнай каманды. У Ромы празмернае жаданне даказаць, што ён здольны на многае. І гэта ідзе яму на карысць. На чэмпіянаце свету ён вельмі добра выглядаў на фоне двухразовага паралімпійскага чэмпіёна француза Бенджаміна Даўе», — расказвае Мікалай Шудзейка.

Яшчэ адзін прадстаўнік маладога пакалення беларускіх паралімпійцаў — Уладзіслаў Кандратаў са Шклова. Хлопцу 18 гадоў, у 14 ён трапіў пад поезд, страціў абедзве нагі. Але не здаўся і стаў займацца спортам. Мікалай Мікалаевіч адзначае, што ў Пекіне для Уладзіслава галоўнае — адчуць атмасферу, спаборніцкі дух і набрацца спартыўнага вопыту.

У сезоне вельмі добра сябе праявіла Кацярына Шасіна. «Мне падабаецца, што ў Каці ёсць спартыўная злосць і жаданне працаваць. А калі не з-пад палкі трэніруешся, то і навык з'яўляецца, і першыя поспехі. Думаю, яе імкненне паказаць сябе з найлепшага боку прывядзе да поспеху. Праўда, пакуль ёй трэба навучыцца кантраляваць эмоцыі, але гэта прыходзіць з вопытам. Кацярына можа вырасці ў моцную спартсменку. Яна скончыла іняз, добра валодае мовай. І на спаборніцтвах дапамагае нам у нейкіх адміністрацыйных пытаннях. Вельмі надзейны чалавек», — адзначае Мікалай Шудзейка.

Сур'ёзна займаецца біятлонам Дар'я Фядзьковіч. На чэмпіянаце свету яна стала пятай у біятлоннай гонцы. Цікава, што спачатку з трэнерам адпрацоўвала толькі класічны лыжны стыль. Пакуль аднойчы не паспрабавала канькова, які адразу добра атрымаўся. Зразумела, што валоданне двума лыжнымі стылямі робіць спартсменку мацнейшай. Таму, па словах Мікалая Шудзейкі, у наступным годзе варта чакаць ад Дар'і вялікага прагрэсу: «На Дашу мы разлічваем у будучыні. Я думаю, удзел у Паралімпіядзе будзе для яе добрым стымулам. Яна ўбачыць, што можа быць канкурэнтаздольнай на высокім узроўні».

### ГАЛОЎНАЕ — ПАДТРЫМКА

Асобна Мікалай Шудзейка адзначае ролю лідараў для спартсменаў з парушэннямі зроку. Гэта спартсмены, якія накіроўваюць паралімпійца на дыстанцыю, папярэджваюць аб спуску, павароце ці пад'ёме. І хоць выніковы час фіксуецца па тым, калі паралімпіец перасячэ фінішную рысу, вынік выступлення ў многім залежыць ад лідара. Часта лідарамі становяцца біятланісты-алімпійцы. Напрыклад, разам з Юрыем Голубам выступае Уладзімір Чапелін, прызёр этапаў Кубка свету і шматлікіх міжнародных турніраў па біятлоне.

«Паміж лідарам і паралімпійцам павінна быць добрая псіхалагічная сумяшчальнасць. Яны абодва павінны быць зацікаўленыя ў выніку. Часта лідары з'яўляюцца і трэнерамі спартсменаў. І мы разлічваем, што нашы спартсмены поўнасцю раскрыюць свае здольнасці», — адзначае Мікалай Шудзейка.

Галоўнай перавагай беларускай каманды генеральны сакратар Паралімпійскага камітэта называе камандны дух і ўзаемападтрымку. Ён спадзяецца, што гэта дапаможа спартсменам паказаць сябе найлепшым чынам. «У камандзе добрая атмасфера і мы заўсёды будзем гэтаму садзейнічаць. Мы дапамагаем адзін аднаму. Трэба несці вінтоўкі — нясу, і няважна, што я — шэф місіі. Не буду ж глядзець, як спартсмены пакутуюць, як ім цяжка. І мы ганарымся, што змаглі сабраць баяздольны калектыў, гатовы дапамагчы адзін аднаму і падтрымаць кожнага, каму патрэбна дапамога», — падкрэслівае Мікалай Шудзейка.

Алімпійскія гульні паказалі, наколькі надвор'е можа ўплываць на вынік біятлонных спаборніцтваў. Спартсмены скардзіліся на непрадказальны вецер і нізкую тэмпературу ў кластары Чжанцзякоў, дзе размешчаны біятлонны цэнтр. Складанасці дадало і тое, што паралімпійцы не ўдзельнічалі ў тэставых спаборніцтвах на гэтых аб'ектах. Але, як адзначае Мікалай Шудзейка, магчыма, паралімпійцам будзе крыху прасцей, выходзячы з вопыту алімпійцаў: «Ніхто не ведае, як будзе паводзіць сябе арганізм у такіх умовах. Усё суб'ектыўна. Спадзяёмся, нашы спартсмены будуць улічваць вопыт Алімпійскіх гульняў і зробяць адпаведныя вывады. У іх будзе некалькі дзён прывыкнуць да вышыні і ўмоў надвор'я. Яны правялі збор у гарах, каб хоць крыху прывыкнуць да вышыні». Эпідэміялагічныя меры для ўдзельнікаў Паралімпійскіх гульняў у Пекіне, вядома, застаюцца такімі ж, якія былі і на Алімпійскіх гульнях.

У цэлым сезон для паралімпійцаў-зімнікаў атрымаўся добры. Як падкрэслівае генеральны сакратар Нацыянальнага паралімпійскага камітэта, спартсмены выступалі годна, паказалі свае здольнасці ў спаборніцтвах з наймацнейшымі саперніцамі. І на Гульнях павінны паказаць узровень. Але аб патэнцыяльнай колькасці медалёў Мікалай Шудзейка казаць не спяшаецца: «Рабіць прагнозы — справа няўдзячная. Такія старты, як Паралімпійскія гульні, — падзея вельмі непрадказальная, таму не варта загадваць».

**Фота Нацыянальнага паралімпійскага камітэта.**

Работа над памылкамі

# На паражэннях вучацца, а поспехамі натхняюцца

## Падводзім вынікі Алімпійскіх гульняў

**У чашы Нацыянальнага алімпійскага стадыёна ў Пекіне патух алімпійскі агонь. XXXII зімовыя Алімпійскія гульні афіцыйна сталі гісторыяй. Цяпер трэба гэта асэнсаваць, прааналізаваць, зрабіць высновы і рухацца далей. Беларускаму спорту неабходна зрабіць дэталёвую работу над памылкамі. У актыве нашых спартсменаў толькі два сярэбраныя медалі. Упершыню з Алімпіяды ў Турыне 2006 года беларусы не заваявалі «золата». Што ж, спорт — гэта не толькі перамогі...**

Лідарам медальнага заліку на цяперашніх Гульнях стала каманда Нарвегіі. Спартсмены гэтай краіны заваявалі 37 медалёў, сярод якіх 16 залатых. На другім месцы ў медальным заліку — Германія з 27 узнагародамі, з якіх 12 — залатыя. А замыкае тройку лідараў Кітай: гаспадары алімпіяды сабралі 15 медалёў, з іх 9 — найвышэйшай пробы. Два беларускія медалі дазволілі нашым спартсменам размясціцца толькі на 24-й пазіцыі. І хоць колькасці медалёў гэтым разам радавацца не прыйшлося, вельмі парадавала іх якасць.




Ганна ГУСЬКОВА.




Антон СМОЛЬСКІ.

### ЗАЛАТОЕ «СЕРАБРО»

«Серабро» Антона Смольскага ў біятлоннай індывідуальнай гонцы — першы алімпійскі медаль для мужчынскай зборнай Беларусі з 2010 года. Тады на Гульнях у Ванкуверы Сяргей Новікаў таксама стаў другім у індывідуальнай гонцы, падзяліўшы «серабро» з легендарным Уле-Эйнарам Б'ёрндаленам. Дзякуючы намаганням Антона Смольскага, беларускія біятланісты не парушылі сваю традыцыю з кожнай Алімпіяды вяртацца з медалём. Праўда, усе прывыклі, што ўзнагароды збіраюць жанчыны. А вось на гэтай традыцыі ў Пекіне прыйшлося спыніцца, прычым за крок да п'едэстала.

Дзінара Алімбекава ў індывідуальнай гонцы стала толькі пятай. Яна ўпэўнена прайшла гонку ў 15 кіламетраў, але дапусціла адзіны промах на апошнім агнявым рубяжы. Гэта каштавала ёй 31,7 секунды адставання ад лідара і прынесла толькі пятае месца. Адзіны недакладны выстрал каштаваў Дзінары медаля і ў спрынтарскай гонцы на 7,5 кіламетра, дзе яна заняла толькі 15-е месца.

Зусім блізка быў медаль і для Ганны Солы ў гонцы пераследу. Але ў выніку — так званы драўляны медаль, чацвёртае месца. Два промахі на стральбе лежачы, адзін промах пры стральбе стоячы не перашкодзілі біятланістцы весці барацьбу за «бронзу». Але ў спартыўнага лёсу былі свае планы.

У 2018 годзе на Алімпійскіх гульнях у Пхёнчхане беларускія біятланісткі сенсацыйна заваявалі «золата» ў эстафеце. Палова таго залатога складу — Дар'я Домрачава і Надзея Скардзіна — спартыўную кар'еру скончыла. Але ж засталіся Дзінара Алімбекава і Ірына Лешчанка. Вядома, аматары чакалі ад іх паўтарэння той гучнай перамогі. Але дзве алімпійскія чэмпіёнкі ў складзе сваёй эстафетнай каманды разам з Ганнай Солай і Аленай Кручынкінай фінішавалі на 13-й пазіцыі. У змешанай эстафеце Дзінара Алімбекава, Ганна Сола, Мікіта Лабастаў і Антон Смольскі занялі шостае месца выніковага пратакола. На гэтай Алімпіядзе беларусы не былі героямі біятлонных спаборніцтваў.



Канстанцін МІЛЮКОЎ.

Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што на біятлоннай трасе ў Чжанцзякоў беларусы змагаліся не толькі з сапернікамі, але і з надвор'ем, якое правярала на трываласць вялікім марозам і моцным ветрам. І гэта ў дадатак да ўмоў высакагор'я. «У такіх экстрэмальных умовах Алімпіяда праходзіла першы раз. Ніколі не было ні такіх маразоў, ні такой вышыні, ні такой ветравой абстаноўкі. Складанасці пераследвалі не толькі нашу каманду, але і ўсіх астатніх. Нехта падрыхтаваны больш, нехта — менш. У цэлым, вядома, гледачы, кіраўніцтва, самі спартсмены і мы, трэнеры, чакалі, што выступленне будзе больш эфектнае. Але ўзнагароды не заслугоўваюць, а заваёўваюць ва ўпартай барацьбе. І нават пры складаных умовах надвор'я мы маглі различваць на медалі. Нельга нікога абвінавачваць у недапрацоўцы. Усе старaліся. У функцыянальным плане да Алімпійскіх гульняў падышлі добра, а вось якасць стральбы пакідала жадаць лепшага», — адзначыў Алег Рыжанкоў, старшы трэнер жаночай каманды. Акрамя таго, у біятланістаў не было магчымасці загадзя праверыць трасу і пазнаёміцца з умовамі. Праз эпідэміялагічныя абмежаванні тэставыя спаборніцтвы ў Кітаі не праводзіліся. «Няхай тут я і зарабіў самую галоўную і цяжкую ўзнагароду ў жыцці, Чжанцзякоў пакідаю з палёгкай. Тут вельмі цяжка і фізічна, і псіхалагічна. Месца незвычайнае», — адзначаў Антон Смольскі.

Пасля Алімпійскіх гульняў беларускія біятланісты адправіліся не на адпачынак, а на збор у Аўстрыю. Ужо 3 сакавіка ў фінскім Кантыялахці стартуе чарговы этап Кубка свету. Нагадаем, што ў агульным заліку Кубка свету Дзінара Алімбекава займае 2-е месца, а Антон Смольскі — 10-е.

Традыцыйна з медалямі з Алімпіяды вяртаюцца і беларускія фрыстайлісты. Пекін гэтую традыцыю, на шчасце, не парушыў. Алімпійская чэмпіёнка 2018 года Ганна Гуськова сёлета заваявала «серабро» ў спаборніцтвах па лыжнай акрабатыцы. Не многім фрыстайлістам у свеце ўдаецца заваёўваць медалі на дзвюх алімпіядах запар. У гісторыі беларускага фрыстайла такое ўдавалася толькі Аляксею Грышыну. Да «бронзы» Солт-Лейк-Сіці 2002 года ён дадаў «золата» Ванкувера-2010. «Рашэнне выконваць такі складаны скачок мы прынялі ўжо на схіле, калі пасля другой спробы я зразумела, што трэба ісці ва-банк. Была ўпэўнена ў сваіх сілах, праўда, скачок было вельмі складана зрабіць, бо ў мяне ён быў толькі ў галаве», — дзялілася Ганна адразу пасля выступлення. Як падкрэсліў старшы трэнер нацыянальнай каманды Міхаіл Курловіч, гэты медаль яшчэ даражэйшы ад таго, што спартсмены выступалі на невядомым схіле, не ведаючы надвор'я. Акрамя таго, кваліфікацыя і фінал праходзілі ў адзін дзень.

Не так паспяхова склалася Алімпіяда для мужчын. У фінал змог прабіцца толькі Станіслаў Гладчанка. Але адзнакі 116,29 бала за найлепшую спробу не хапіла, каб увайсці ў шасцёрку ўдзельнікаў суперфіналу. На думку Міхаіла Курловіча, скачкі і прызямленне, якія паказаў Станіслаў Гладчанка, заслугоўвалі больш высокай адзнакі. Найлепшых вынікаў чакалі ад вопытнага Максіма Гусціка. Дэбютаваць на Гульнях мог бы Макар Мітрафанаў, але ўмяшалася траўма, атрыманая на трэніроўцы. Першая Алімпіяда камяком атрымалася і для Паўла Дзіка. Гульні ў Пекіне сталі дэбютнымі для Анастасіі Андрыянавай і Ганны Дзяругі, прычым Анастасія змагла прабіцца ў фінал. Як падкрэсліў Міхаіл Курловіч, беларускую каманду чакае змена пакаленняў. Некаторыя хлопцы-юніёры ўжо выйшлі на трайныя сальта. Наперадзе — вельмі цікавыя чатыры гады.

А ў Ганны Гуськовай і іншых членаў нацыянальнай каманды наперадзе яшчэ два этапы Кубка свету.

### ГІСТОРЫЯ СТВАРАЕЦЦА НА ЛЁДЗЕ

Спаборніцтвы па фігурным катанні на Алімпійскіх гульнях у Пекіне сталі сапраўды гістарычнымі. Увесь свет будзе доўга памятаць, як зламалі галоўную фаварытку Гульняў Камілу Валіеву, якую ўсе Гульні суправаджаў допінгавы скандал. Гісторыя несправядлівая і вельмі крыўдная. На гэтых Гульнях двухразовы алімпійскі чэмпіён, непераможны Юдзуру Ханю стаў толькі чацвёртым. А Ганна Шчарбакова, як і французскія танцоры Габрыэла Пападакіс і Гіём Сізерон, сенсацыйна заваявалі залатыя медалі. Алімпійскія гульні ў Пекіне сталі вельмі знакавымі для сусветнага фігурнага катання. І для беларускага таксама. Упершыню з 2002 года ў алімпійскіх стартах удзельнічалі і беларускія фігурысты. Адзіная прадстаўніца Беларусі ў жаночым адзіночным катанні Вікторыя Сафонава размясцілася на 13-м радку выніковага пратакола. Па суме дзвюх праграм Вікторыя набрала 184,83 бала. А Канстанцін Мілюкоў з сумай 222,2 бала заняў 20-ю пазіцыю ў выніковым пратаколе. Новая алімпійская старонка пачалася зусім нядрэнна. А наперадзе, у сакавіку, чэмпіянат свету.

І пра беларускіх канькабежцаў. Найлепшым вынікам Марыны Зуевай стала сёмае месца ў масстарце, на такой жа пазіцыі яна размясцілася па выніках камандная гонкі пераследу. У іншых відах індывідуальнай праграмы яна была 23-й, 16-й і 9-й. Максімум Ігната Галавацюка на гэтых гульнях — шостае месца на дыстанцы 1000 метраў, да бронзавага медаля яму не хапіла ўсяго 0,15 секунды. Ёсць шанец узяць рэванш на чэмпіянаце свету і ў фінале Кубка свету.

**Пасля Алімпійскіх гульняў беларускія біятланісты адправіліся не на адпачынак, а на збор у Аўстрыю. Ужо 3 сакавіка ў фінскім Кантыялахці стартуе чарговы этап Кубка свету.**

### ГАЛОЎНЫ САПЕРНІК НЕ ШКАДУЕ

На жаль, пакуль хэдлайнерам Алімпійскіх гульняў застаецца... каранавірус. Арганізатары Алімпіяды прынялі ўзмоцненыя меры бяспекі для прадухілення рызык заражэння COVID-19. Гульні праходзілі ў так званых ахоўных пузырах — на спецыяльных тэрыторыях, агароджаных ад кантактаў з навакольным асяроддзем. Але каранавірус усё роўна быў галоўным сапернікам алімпійцаў. Перамог ён і беларусаў. Перш чым выйсці на старт, беларускія лыжнікі Анастасія Кірылава, Ганна Каралёва і Аляксандр Воранаў здалі тэсты, якія аказаліся станоўчымі. «Некаторым тут прыйшлося заплаціць дастаткова высокую цану. Асобныя спартсмены былі ізаляваны. Гэта самае цяжкае выпрабаванне — прысутнічаць на Гульнях, бачыць, як вашы апаненты спаборнічаюць, а вы знаходзіцеся ў ізаляцыі і не з'яўляецеся часткай Гульняў, хоць многія гады працавалі дзеля гэтага моманту. Гэта сур'ёзнае псіхалагічнае выпрабаванне для спартсменаў», — адзначыў прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта Томас Бах на прэс-канферэнцыі.

Алімпійскія гульні не заканчваюца цырымоніяй закрыцця, яны не згасаюць разам з алімпійскім агнём. Гэта самая важная праверка і самы важны спартыўны экзамен. Цяпер прыйшоў час падводзіць вынікі чатырохгадовай работы і, безумоўна, ставіць мэты і будаваць планы на наступны цыкл.



Ігнат ГАЛАВАЦЮК.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

# КЛОПАТ ПРА ТЫХ, ХТО КЛАПОЦІЦЦА

**Напэўна, практычна ў кожнага сярод знаёмых ёсць тыя, хто даглядае сваіх хворых сваякоў. Калі закранаецца гэта тэма, як правіла, у цэнтры ўвагі аказваюцца людзі, пра якіх клапоцяцца. Хоць часта дапамога ў большай ступені патрэбная менавіта тым, хто клапоціцца. Многія ж лічаць, што яны моцныя, справяцца самі. Працягваюць даглядаць іншага, забываючыся пры гэтым на сябе і праз нейкі час самі ўпадаюць у цяжкую дэпрэсію і эмацыянальна выгараюць.**



Фота journal.openagent.ru

## «Пастаянна знаходзіцца побач з хворым — яшчэ тое выпрабаванне»

Мая сённяшняя гераіня — Тацццяна Шаранда, дзіцячы і сямейны псіхолаг. Усё жыццё яна дапамагае іншым знаходзіць выйсце з крызісных сітуацый. І вось не так даўно дапамога спатрэбілася ёй самой. Паўтара года таму ў яе цяжка захварэў муж.

— З пачатку пандэміі мы з Сашам ажно чатыры разы перахварэлі на ковід. Ужо пасля першай хвалі я заўважыла змены ў паводзінах мужа. Але тады не надала ім належнай увагі, бо проста не ведала сімптомаў дэменцыі пачатковай стадыі. Калі б у той момант я зразумела, што адбываецца, і пачала дзейнічаць, магчыма, усё склалася б па-іншаму. Бо не сакрэт, што пры лёгкай ступені хваробы і медыцынская, і псіхалагічная дапамога найбольш эфектыўныя. Але замест таго, каб біць ва ўсе званы, я злавалася і раздражнялася на блізкага чалавека. Мой муж — інжынер-канструктар, яму належаць вельмі сур'ёзныя распрацоўкі, і раптам ён пачаў рабіць прымітыўныя памылкі. Вядома, у маёй галаве гэта не ўкладвалася.

**«Калі адчуваеш радасць, задавальненне — ты напаўняешся. Любы ж негатыўны стан спустошае. Надыходзіць момант, калі не ведаеш, хто ў больш цяжкім стане: хворы ці ты сам».**

Пасля таго як Аляксандр перахварэў на ковід трэці раз, кагнітыўныя парушэнні праявіліся ў поўнай меры. У яго развіўся пастковідны сіндром, які выліўся не толькі ў дэменцыю, але і ў хваробу Альцгеймера.

— Усё адбывалася вельмі імкліва. Сказаць, што я была ў роспачы, — нічога не сказаць. У мяне быў шок. Я зусім не ўяўляла, куды бегчы, што рабіць, бо ніколі з гэтым не сутыкалася.

Хтосьці падказаў Тацццяне пракансультавацца ў гарадскім Цэнтры псіхіятрыі і псіхатэрапіі, што ў сталіцы на вуліцы Бехцерава.

— Нам давялося прайсці праз вялікую колькасць псіхатэрапеўтаў. Але ніякага эфекту не было. Пакуль нейкім цудам не трапілі на спецыяліста, якая падказала схему лячэння, і яна нам падышла. Разам з тым я як псіхолаг разумею, што на адным медыкаментозным лячэнні далёка не даедзеш. Даказана, што вельмі многае ў руках самога чалавека. Магчыма, вы чулі гісторыю пра дзіця, якое нарадзілася з паловай галаўнога мозгу. І мама з татам дабіліся таго, што дзяўчынка вырасла і вядзе паўнацэннае жыццё, бо правае паўшар'е цалкам кампенсавала функцыі левага.

***— Але ж чалавек, які дапамагае іншаму, сам павінен быць у рэсурсным стане. У адваротным выпадку дапамога спатрэбіцца абаім.***

— Пастаянна знаходзіцца побач з хворым чалавекам — яшчэ тое выпрабаванне. У нейкі момант сапраўды адбываецца магутнае эмацыянальнае выгаранне. Унутры цябе «кактэйль Молатава» з негатыўных эмоцый і пачуццяў. Увесь час кантралюеш сябе, каб «не выбухнуць». Атрымліваецца, што ты сам у сабе гасіш эмоцыі. І паступова «выгараеш». Калі адчуваеш радасць, задавальненне — напаўняешся. Любы ж негатыўны стан спустошае. Надыходзіць момант, калі не ведаеш, хто ў больш цяжкім стане: хворы ці ты сам.

Спачатку Тацццяна спрабавала аднавіць свой унутраны рэсурс праз ежу. А аднойчы, зайшоўшы ў краму па прадукты, не заўважыла, як апынулася ў алкагольным аддзеле. Хоць алкаголь наогул не ўжывае і цярпець не можа піва.

— Тым разам я купіла бутэльку піва. Прайшоў тыдзень-два, і я злавіла сябе на тым, што калі заходжу ў краму, вачыма пачынаю шукаць алкагольны аддзел. Мяне цягнула туды як магнітам. Так я падсвядома шукала, як зняць унутранае напружанне. У выніку разы 2-3 купіла піва, і мяне адвярнула. Затым «правалілася» ў камп'ютарныя гульні. Гэта і ёсць замяшчэнне сябе, сыход ад рэальнасці — так фарміруюцца ўсе залежнасці. Гуляю, расслабляюся, мне падаецца, што ў маім жыцці ўсё аднавілася. А заканчваецца гульня, і я зноў сутыкаюся з рэальнасцю. Напэўна, калі б не веды па псіхалогіі, я захрасла б у нейкай залежнасці...

Менавіта ў гэты момант жанчыне патэлефанавала Вольга Шышло, куратар вучэбных груп Універсітэта трэцяга ўзросту, створанага ГА «Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў». Да пандэміі Тацццяна выкладала там псіхалогію сталым «студэнтам».

— Ёй, відаць, дзяўчаты з нашай групы расказалі пра маю бяду, бо мы перыядычна стэлефаноўваліся, і я дзялілася з імі сваімі праблемамі. Вольга падказала мне, куды звярнуцца, дала кантакты сваіх калег. Я, напрыклад, не ведала, што ў нас у Мінску ёсць грамадская дабрачынная арганізацыя «Хэсэд-Рахамім», дзе дапамагаюць не толькі людзям з дэменцыяй, але і іх сваякам. Таксама ад Вольгі я даведалася пра сацыяльны праект «Клопат пра тых, хто клапоціцца».

## «Калі б я не цягнула сябе з багны, дакладна б ужо захварэла»

***— У студэнткі Універсітэта трэцяга ўзросту Вольгі Жук шмат знаёмых, якія даглядаюць сваіх хворых сваякоў. Яна сказала, што многія з іх праз нейкі час самі захварэлі на рак.***

— Нічога дзіўнага. Калі не хапае ўнутранага рэсурсу, абавязкова ўключаецца псіхасаматыка. Я па сабе ўжо бачу, што без рэгулярнай працы па самааднаўленні я ўжо дакладна захварэла б. Той, хто даглядае хворага, пастаянна знаходзіцца ў пазіцыі даўжніка. Ты ўвесь час павінен яго кантраляваць: хапаеш за руку, каб не нашкодзіў, вядзеш некуды, корміш, сочыш, каб, не дай бог, не ўключыў газ. Гэта вымотвае. Асабіста ў мяне слабае звяно — зрок. Я даўно так хутка не страчвала яго, як цяпер, менавіта на нервовай глебе.

***— Тацццяна, а як вы змагаецеся з негатыўнымі эмоцыямі, раздражненнем, як падбіраеце словы ў зносінах з мужам, каб і яму дапамагчы, і сабе не нашкодзіць?***

— Спачатку я пастаянна павышала голас, мяне раздражнялі неадэкватныя ўчынкі Сашы (ён, напрыклад, мог паставіць туфлі ў вядро з вадой). І толькі потым зразумела, што гэта было замкнёнае кола. Чым больш я зрывалася, тым больш ён унутрана закрываўся ад страху. У тыя моманты, калі Сашу было цяжка, ён трымаўся рукамі за галаву: «Таня, калі б ты ведала, як мне складана табе штосьці сказаць, я не разумею ўласных думак». Калі я ўсвядоміла і прыняла той факт, што Саша хворы, што ён насамрэч нічога не разумее, раздражненне змянілася на спачуванне. І, як ні дзіўна гэта гучыць, менавіта тады ўва мне пачало зараджацца пачуццё нават любові да мужа. Сышлі ўсе яго негатыўныя якасці. Я разумею, што ён сам пакутуе. Цяпер я ўвесь час трансліую Сашу «ты ў бяспецы», і яму робіцца крыху лягчэй.

Часам у крытычныя моманты я ўсё ж такі раздражняюся. Напрыклад, едзем мы ў метро, раптам Саша ўскоквае і збіраецца выбягаць з вагона. У гэты момант я адчуваю страх. Мне ж трэба паспець яго схапіць. Потым страх трансфармуецца ў раздражненне. Я ў гэты момант яму нічога не кажу. Проста дыхаю. Дыхальная гімнастыка па сістэме цігун мне вельмі дапамагае. Яна ёсць у інтэрнэце, пры жаданні кожны можа навучыцца. Некалькі разоў раблю ўдых-выдых і супакойваюся. І толькі тады заўважаю спужаныя вочы мужа. І ўсё раздражненне як быццам некуды сыходзіць. Разумею, што ён сам баіцца. У нейкі момант ува мне ўключыўся мацярынскі інстынкт. І мне хочацца яго ратаваць, абараніць як дзіця.

***— А як без вялікіх фінансавых укладанняў можна дапамагчы самому сабе?***

— Працэс самааднаўлення лепш пачынаць з работы са сваім целам. У першую чаргу гэта фізічная актыўнасць на свежым паветры. Сонца і рух спрыяюць выпрацоўцы гармонаў шчасця і радасці — эндарфіну, сератаніну, дафаміну, аксітацыну. Няважна, што мне 60 гадоў. Калі толькі з'яўляецца такая магчымасць, я абавязкова саджуся на веласіпед і накручваю кіламетры. Вельмі дапамагае холадатэрапія, у прыватнасці, абціранне лёдам (я замарожваю ў маразільніку ваду ў формачках), але толькі пасля актыўнай фізічнай нагрузкі, калі арганізм унутры разагрэўся. Таксама добра абцірацца проста халодным махровым ручніком. Цудоўна, калі вам хтосьці можа зрабіць масаж усяго цела, калі не — не бяда. Я, напрыклад, выкарыстоўваю аплікатары Кузняцова ды Ляпко. Цудоўны эфект даюць і масажныя калючыя «каштаны» для разагрэву далоняў. Таксама дапамагае зняць унутранае напружанне і самамасаж галавы. Калі ёсць такая магчымасць, можна заняцца арт-тэрапіяй. Або лепкай. І для гэтага неабавязкова запісвацца на курсы. Проста купіце дадому пачак пластыліну. Асабіста мне пашанцавала: у мяне вельмі класны кабінет. Калі раней я праводзіла сеансы хроматэрапіі толькі для сваіх кліентаў, то цяпер сама саджуся і лячуся святлом. А яшчэ ўсім без выключэння раю асвоіць тэхніку рэлаксацыі па метадзе Джэкабсана. Яна бясцэнная.

Тацццяна па-ранейшаму працягвае хадзіць на працу, кансультаваць сваіх кліентаў. І гэта таксама тэрапія, прычым як для самой жанчыны, так і для яе мужа.

— Заўважыла, што калі я пастаянна дома, з мужа здымаецца адказнасць, і стан Сашы пагаршаецца. Таму перыядычна пакідаю яго аднаго. Калі сыходжу, абавязкова перакрываю газ і зачыняю дзверы на ключ. Мы з мужам выпрацавалі дакладны алгарытм дзеянняў. Пакуль мяне няма, Саша глядзіць фільмы на камп'ютары, ходзіць на кухню і разагравае сабе ежу ў мікрахвалеўцы. Праўда, кожныя паўгадзіны ён пачынае мне тэлефанаваць, бо ў нейкі момант не разумее, дзе я. Выбачаюся перад кліентамі, кажу, што мне трэба дзве хвіліны, каб патлумачыць сітуацыю мужу. Усе разумеюць, спачуваюць.

Кабінет Тацццяны знаходзіцца непадалёк ад сталічнага ЦУМа. І яна гатова бясплатна кансультаваць пажылых людзей, якія трапілі ў падобную сітуацыю.

— Я сама прайшла праз гэты кашмар, таму як ніхто разумею, наколькі важна, асабліва напачатку, каб хтосьці падказаў, як сябе паводзіць. Акрамя таго, ва Універсітэце трэцяга ўзросту мяне папрасілі правесці вэбінар для сваякоў, якія даглядаюць сваіх блізкіх. І я з радасцю гэта зраблю, падзялюся досведам, як працую на самааднаўленне, бо ў звычайных людзей не хапае ведаў на гэтую тэму. Я па жыцці аптыміст, шчыра веру, што непераадольных праблем няма, галоўнае — знайсці правільны падыход да іх рашэння.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

**Павел ЛОТВІН, кіраўнік Мінскага клубнага дома «Адкрытая душа»**: «Для людзей, якія даглядаюць хворых сваякоў, важна адчуваць, што яны не адны».

— Сацыяльны праект «Клопат пра тых, хто клапоціцца» створаны спецыяльна для сваякоў людзей з псіхічнымі захворваннямі. У яго межах праходзяць як афлайн-, так і анлайн-сустрэчы, падчас якіх кваліфікаваныя спецыялісты вучаць, як можна палегчыць не толькі жыццё чалавека, якога вы даглядаеце, але і сваё. Дапамагаюць справіцца са стрэсам, посттраўматычным станам і эмацыянальным выгараннем. Вучаць распазнаваць першыя прыкметы абвастрэння захворвання, што дазволіць папярэдзіць і скараціць частату паўторных шпіталізацый вашага блізкага. Падказваюць, куды звярнуцца па дапамогу. Таксама нашы псіхолагі, псіхіятры і юрысты праводзяць і індывідуальныя кансультацыі. Створаны чаты, дзе людзі, якія сутыкнуліся з падобнай праблемай, абменьваюцца досведам, падтрымліваюць адно аднаго. Самае галоўнае — яны бачаць, што не адны, што з падобнымі праблемамі жывуць і іншыя.

Усе мерапрыемствы, якія праходзяць у межах праекта, бясплатныя. Ладзяцца яны на базе клубных дамоў (службы рэабілітацыі для людзей з псіхічнымі расстройствамі, створаныя Беларускай асацыяцыяй сацыяльных работнікаў) у Мінску, Брэсце і Лідзе. Людзі, якія жывуць у іншых гарадах і вёсках, могуць падключацца да вэбінараў анлайн-цэнтра падтрымкі сваякоў, якія даглядаюць чалавека з псіхічным захворваннем. Расклад можна знайсці на сайтах і ў сацсетках клубных дамоў.

### Кантакты клубных дамоў:

Мінскі Клубны дом (вул. Кнорына, 3, тэл. +37525-768-71-24);

Брэсцкі Клубны дом (вул. Камсамольская, 46, тэл. +37529-330-31-61);

Лідскі Клубны дом (вёска Астроўля, на тэрыторыі абласной псіханеўралагічнай бальніцы, тэл. +37529-181-89-27).

# ПАЭТ ВЕДАЕ ЦАНУ ШЧАСЦЯ

**Выдадзеная ў Дзяржаўным выдавецтве БССР у 1958 годзе кніга Рыгора Бярозкіна «Паэзія праўды» складаецца з грунтоўных творчых партрэтаў Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Максіма Танка.**

Цытуем Рыгора Бярозкіна: «...Ёсць у Пімена Панчанакі вершы «Заўсёды гатовы!» — аб тым, як у розныя перыяды жыцця — спачатку піянерам, потым камсамольцам перад адыходам на фронт, а затым камуністам, які вярнуўся з перамогай, — прыходзіў паэт да помніка Ільіча, каб набрацца новых душэўных сіл і новай душэўнай бадзёрасці. «Заўсёды гатовы!» — адказваў ён на заклікі партыі, выпеставанай Ільічом. «Заўсёды гатовы!» — рапартуе і сёння неспакойнае, гарачае сэрца паэта, якое па-ранейшаму маладое і, як заўжды, з велізарнай, адзінай праўдай удваіх».

... У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь з пазнакай «Группа писем ЦК КП Белоруссии 6 марта 2336» захоўваецца ліст Пімена Панчанкі да Пятра Міронавіча Машэрава. Зусім кароткі. Вось з якім клопатам звяртаецца на той час аўтар многіх кніг, аўтарытэтны пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы да першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі... «Дарагі Пётр Міронавіч! Без працы, без калектыву жыць я


Дарагі Пётр Міронавіч!
Без працы, без калектыву жыць я не магу.
Дайце мне магчымасць папрацаваць у «Полымі».
Самае горкае адчуванне, калі ты не патрэбны
роднай партыі.
Я хварэў. Цяпер здольны працаваць.
З глыбокай павагай —
Пімен Панчанка
28. II. 72.

не магу. Дайце мне мажлівасць папрацаваць у «Полымі». Самае горкае адчуванне, калі ты не патрэбны роднай партыі.

Я хварэў. Цяпер здольны працаваць.
З глыбокай павагай —
Пімен Панчанка.
28. II. 72 г.»



3 сакавіка Пётр Міронавіч прачытаў ліст і накладвае рэзалюцыю: «Кузьмину А.Т. Каково Ваше мнение?..» Аляксандр Трыфанавіч сакратаром ЦК па ідэалогіі быў абраны ў лютым 1971 года. Да гэтага часу працаваў некаторы час загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ. І, канешне ж, каму, як не Аляксандру Трыфанавічу, вырашаць пытанне, чым далей займацца вядомаму паэту... Да нядаўняга часу Пімен Емяльянавіч працаваў сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. У гэты перыяд выйшлі яго кнігі «Пры святле маланак» (1966), «Размова з наследнікамі» (1967), у гэты перыяд, відавочна, пісаліся вершы, якія пасля складуць зборнікі «Снежань» (1972), «Вершы» (1973)...

Чаму зборнік названы «Снежань»?.. «Слаўлю службу верную, // Слаўлю дружбу вечную! // Нарадзіў Кастрычнік нас, снежань парадніў».

... І вось, як гэта выглядае па кароткім звароце Панчанкі аж першаму сакратару, да паэта праяўляецца нейкі недавер... І ўсё ж ліст разглядаецца.

Тым болей, што 9 сакавіка А. Кузьмін піша запіску тав. Марцэлеву С. В. Так, загадчыкам аддзела культуры ЦК на той час працаваў Станіслаў Віктаравіч Марцэлеў (1926—2003), у будучыні шматгадовы дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1976—2003), доктар гістарычных навук, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР. Запіска даволі лаканічная і для падначаленых, пэўна ж, зразумелая: «Тов. Марцелеву С. В. Заключение отдела. Я — против...». Значыць, тэрмінова рыхтаваць «заключэнне аддзела» ў адпаведнасці з меркаваннем...

15 сакавіка 1972 года Алесь Савіцкі, у той час загадчык сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК, піша сваё заключэнне: «Пятилетняя практика работы т. Панченко секретарем Союза писателей БССР говорит о нецелесообразности направления его на работу в редакцию журнала «Полымя».

Учитывая договоренность т. Панченко с руководством Союза писателей, считали бы возможным поддержать просьбу М. Танка о работе т. Панченко в должности главного редактора издательства «Художественная литература».

16 сакавіка на гэтым дакуменце з'яўляецца рэзалюцыя А. Кузьміна: «Марцелеву С. В. Вносите проект согласно договоренности (К. Киреенко)». Вось і сыходзіцца ўсё... У аддзеле, ужо, відавочна, атрымаўшы падтрымку зверху, усё вырашылі за Пімена Емяльянавіча. Лёс Паўла Кавалёва, які яшчэ рэдагаваў «Полымя», быў вырашаны. 15 сакавіка адзін з работнікаў ЦК дакладвае наверх: «Принято постановление бюро ЦК КП Белоруссии об освобождении Ковалёва П.Н. от обязанностей главного редактора журнала «Полымя» и назначении ему персональной пенсии...» І на яго, Паўла Кавалёва, месца галоўнага рэдактара «ўводзілі» Кастуся Кірэенку, які быў галоўным рэдактарам «Бярозкі»... Што да выдавецтва, то Панчанка не туды разлічваў трапіць. Але і ў «Художественную...» — трэба разумець у «Мастацкую літаратуру» (выдавецтва яшчэ толькі нараджалася) — Пімен Емяльянавіч не пайшоў. Астатнія гады аддаў выключна творчай працы.

Як па тым часе, то зусім не горшы варыянт... Творца заставаўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Шмат пісаў, шмат друкаваўся. Адна за адной выходзілі яго кнігі. У 1981 годзе за «Дзе начуе жаваранак?» паэту была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. І ў няпростыя гады перабудовы, апошнія гады свайго жыцця, Панчанка заставаўся сумленным, шчырым творцам. Пра гэта сведчыць і «Паэма сораму і гневу», якая выклікала ў свой час сапраўдны грамадзянскі розгалас...

А Рыгор Бярозкін і ў 1958 годзе, нягледзячы на ўсё тое, што не давала магчымасці выказацца напоўніцу адкрыта, бачыў перад сабою ўсю веліч панчанкаўскай паэзіі: «Паэзія Панчанкі апошніх год не легкадумна-бадзёрая — яна ведае сапраўдную цану чалавечага шчасця і дзейсна змагаецца за вернасць і шчырасць, за дружбу і давер. Няма ў вуснах паэта характарыстыкі больш знішчальнай, чым тая, якую ён даў аднаму са сваіх знаёмых у вершы «Смеласць»: «І так: на дні збаяцца тройчы, // Разоў пятнаццаць памыліцца // І пазіраць сябрам у вочы, // Нібы на допыце ў міліцыі...» Ёсць яшчэ адна рыса ў творчасці Панчанкі, якая робіць яго новыя вершы на дзіва сугучнымі сённяшняму перыяду ў развіцці савецкага грамадства: гэта — узмоцненая цікавасць паэта да рэальна-бытавых праблем нашага жыцця, да тэм маральна-этычнага парадку...»

Можна толькі здагадвацца, якім бы галоўным рэдактарам быў Пімен Панчанка ў «Полымі»... Хутчэй за ўсё — сумленным і смелым. У яго ж быў і добры вопыт працы галоўным рэдактарам у «Маладосці» — 1958—1966 гады. Гэта было ў памяці і многіх аўтараў, якім ён працягнуў руку дапамогі. Відаць, памяталі пра гэта і ў ЦК роднай партыі...

Усё ж паэт ведаў цану чалавечаму шчасцю. Пра гэта сведчаць многія яго вершы і з тых кніг, якія ён напісаў пасля «службы» ў пісьменніцкім саюзе: са зборнікаў «Крык сойкі», «Вячэрні цягнік», «Млечны шлях», «Маўклівая малітва», «Сіні ранк», «Лясныя воблакі», «І вера, і вернасць, і годнасць», «Горкі жолуд»... Пімен Панчанка не сароме́ўся быць гранічна адкрытым і шчырым... Як, напрыклад, у «Паэме сораму і гневу»: «Я ссек сады, // Прынёс бяду лясам, // Я сеяў кукурузу на балотах, // Абкрадзены народ // Пачаў цягнуць і сам, // І п'яніцы валяліся пад плотам. // Настала эра паразітаў і папер. // Зямлю я разлюбіў, // Уцёк з калгаса. // І працы мудры лад // Ледзь не пагаснуў. // А я пісаў пра дробязь // І... цярпеў. // То я ўзрасціў няўмек і гультаёў. // Застой. Крадзёж. // На складах — горы дрэні. // Зямлі і праўды, мовы і гаёў // Ірвалі мы спрадвечныя карэнні. // Я не збярог Купалу, // Мову не збярог. // Мне літасці няма і даравання. // Канчаецца апошняя з дарог, // Век ядзерны пачаў сваё рыканне. // «Ідзі хутчэй у свой любімы бор, — // Крычыць, — не ты ў бядзе той вінаваты». // Я сам сабе суддзя і пракурор, // Ну хоць шукай стары трафейны «вальтэр»...» Мужныя словы сумленнага творцы, у якога на жыццёвым шляху былі самыя розныя выпрабаванні.

**Мікола БЕРЛЕЖ,**
**Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.**

# «ГАДЗІНА МОВЫ» З «УПЭЎНЕНАСЦЮ»

**Учора, у Міжнародны дзень роднай мовы, у Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі ўрачыста адкрылася выстава «Гадзіна мовы».**



На выставе ўпершыню прадстаўлены сем мадэляў гадзіннікаў завода «Луч» лімітаванай калекцыі «Мова», выпушчаныя ў 2019–2022 гг.

Апошнія рэлізы калекцыі прысвечаны народнаму паэту Беларусі — Пімену Панчанку з нагоды 105–годдзя з дня яго нараджэння. За аснову дызайна Мінскі гадзіннікавы завод узяў першы зборнік вершаў паэта — «Упэўненасць» 1938 года, у якім усхваляецца хараство і багацце роднай зямлі.

«Прыхільнікам беларускай літаратуры добра вядома імя Пімена Панчанкі — паэта і публіцыста, крытыка і перакладчыка. Галоўнае ў яго творчай спадчыне — вершы, у якіх выказваюцца думкі і надзеі эпохі, вершы, у якіх адлюстроўваецца багатая гама чалавечых пачуццяў. Яго паэзія, непаўторная і глыбока нацыянальная, назаўжды ўвайшла ў залаты фонд беларускай літаратуры мінулага стагоддзя», — адзначыў **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША**.

На адкрыцці выставы прысутнічала ўнучка Пімена Панчанкі — Кацярына Андрэеўна Панчанка, дызайнеры і аўтары калекцыі «Мова» з Мінскага гадзіннікавага завода.

Экспазіцыя будзе працаваць у Музеі кнігі да 21 сакавіка.

# Унікальныя знаходкі ў Нацыянальным гістарычным музеі

**Выставачны праект «Лёс Музея — лёс Краіны. Шлях даўжынёй у стагоддзе» працуе гэтымі днямі ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, паведамілі ў музеі.**

На выстаўцы прадстаўлены разнастайныя музейныя экспанаты — артэфакты з розных гістарычных эпох, сабраныя супрацоўнікамі музея ў 1919 – 1950 гады. Гэта ўнікальныя знаходкі з першых у краіне археалагічных раскопак, прадметы сялянскага і гарадскога побыту, фатаграфічныя здымкі і замалёўкі з этнаграфічных экспедыцый, творы мастацтва, сабраныя з палацаў і маёнткаў, рукапісы, кнігі ды шмат іншага. Кожны музейны экспанат, які будзе прадстаўлены на выстаўцы, захоўвае ў сабе шмат гісторый. Некаторыя музейныя прадметы будуць прадстаўлены наведвальнікам упершыню.

«Выстаўка прыадкрывае адну з няпростых, але вельмі цікавых старонак айчыннай гісторыі, якая прысвечана нараджэнню і станаўленню буйнейшага музея краіны — Нацыянальнага гістарычнага музея», — адзначылі ва ўстанове культуры.

Выставачны праект раскажа аб гісторыі стварэння музея, аб збіральніках і захавальніках нацыянальных каштоўнасцяў, а таксама аб музейных калекцыях.

Выстаўка створана на аснове даследаванняў навуковых супрацоўнікаў Нацыянальнага гістарычнага музея. Раздзелы экспазіцыі адлюстроўваюць самыя значныя этапы ў яго гісторыі.

У выставачным праекце прымаюць удзел: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.



З хатняга архіва

# «ИХ ХОЛОДНЫЕ ОБЕЗОБРАЖЕННЫЕ ТРУПЫ ВЗЫВАЮТ О МЩЕНИИ!»

## Вайсковы дзённік Мікалая Красоўскага



**Некалькі гадоў таму на сцяжынах лёсу мне пашчасціла пазнаёміцца з Аляксандрам Мікалаевічам Красоўскім, фізікам-метэаролагам, выкладчыкам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, чалавекам дужа цікавым і неардынарным.**

Паколькі жывём па суседстве, перыядычна сустракаемся з Аляксандрам Мікалаевічам пры няспешнай гаворцы. Падчас адной з такіх сустрэч я і даведаўся пра гісторыю жыцця бацькі майго суразмоўцы — Мікалая Ільіча Красоўскага, чалавека, які добра ведаў Янку Купалу і Якуба Коласа, сябраваў з сям'ёй Петруся Броўкі, працаваў побач з Панцеляймонам Панамарэнкам, Цімохам Гарбуновым і многімі іншымі кіраўнікамі БССР пасляваеннага часу.

### СЫН ПОЛАЦКАГА МУЛЯРА

Мікалай Красоўскі нарадзіўся 19 снежня 1908 года ў горадзе Полацку.

Бацька яго, Ілья Радзівонавіч, працаваў мулярам-цэхавіком, працягваў слаўныя традыцыі самага старадаўняга беларускага горада. Маці — Кацярына Іванаўна — даглядала шматлікую сям'ю і гадавала дзяцей, якіх было дзесяцёра. Мікалай Красоўскі быў самым малодшым сярод дзесяці родных сясцёр і братоў (меў розніцу са старэйшым братам Сяргеем у 22 гады).

Бурлівыя падзеі пачатку XX стагоддзя прынеслі ў сям'ю гора: бацькі Мікалая Красоўскага памерлі ад эпідэміі іспанкі, і дзеці засталіся сіротамі. Пасля гэтага Мікалай гадаваўся разам з чатырма сынамі старэйшага брата Сяргея.

Усталяваная савецкая ўлада прынесла магчымасць вучобы ў знядоленыя сем'і. Расхінула яна далягляды і для Мікалая Красоўскага. У 1921 годзе ён паступіў у Другую Полацкую Беларускую Узорную сямігадовую школу, а ў 1926-м — у Полацкі педагагічны тэхнікум, узровень адукацыі ў якім быў вельмі высокі (пазней на яго базе быў створаны інстытут). Тагачасны атэстат тэхнікума за № 1323 сведчыць: *«Красоўскі Мікола Ільіч лічыцца скончыўшым курс Тэхнікуму па школьнаму аддзяленню і яму надаецца годнасьць настаўніка школ I кат., што сьведчыцца подпісамі і прыкладам пячаткі. Гор.Полацак, месяца травеня 30 1930 г.»*.

Пасля заканчэння тэхнікума Мікалай Красоўскі працуе дырэктарам Ульскай школы сельскай моладзі. Са жніўня 1932 да верасня 1939 года з'яўляецца дырэктарам Полацкай чыгуначна-дарожнай сярэдняй школы № 59. Адначасна вучыцца завочна на гістарычным факультэце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. З 1939 года пачаў працаваць у партыйных органах, быў сакратаром Брэсцкага гаркама, сакратаром Брэсцкага абкама КП(б)Б.

### ВЫПРАБАВАННІ ВАЙНЫ

Пачатак вайны сустрэў у Брэсце. Давялося арганізоўваць эвакуацыю, потым змагацца супраць фашысцкіх захопнікаў на фронце і ў тыле ворага, працаваць у Беларускім штабе партызанскага руху. Займаўся і дакументаваннем абставінаў разгортвання партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі. Да нашага часу захаваліся два друкапісы адпаведных гутарак: з камандзірам партызанскага атрада імя Суворава Лявонцьевым Андрэем Лявонавічам ад 17.08.1943 і з арганізатарам падпольнага і партызанскага руху на Брэстчыне Жыжкам Іванам Іосіфавічам ад 23.08.1943.

Сярод зробленага — арганізацыя друкавання і дастаўкі ў акупаваную Беларусь падпольнай літаратуры. Паводле ўспамінаў сына, Аляксандра Мікалаевіча Красоўскага, Мікалай Красоўскі ў тым ліку расказваў, што менавіта




такім быў шлях у свет шэрагу кніг з творамі змагання, папулярных сатырычных лісткоў ваеннага часу (як на цяперашні лад — коміксаў), шматлікіх лістовак і падпольных газет на беларускай і рускай мовах.

Пасля вызвалення Беларусі Красоўскі працаваў сакратаром Брэсцкага абкама КП(б)Б па прапагандзе. У першыя дні вызвалення на чыгунцы Брэста стаялі цягнікі з падрыхтаванымі да вывазу ў Германію кніжнымі скарбамі. Так што Мікалай Красоўскі асабіста ўдзельнічаў у вяртанні Беларусі яе кніжнай спадчыны.

Ён быў адным з першых, хто пачаў уздымаць тэму подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Менавіта таму каля тысячы прадметаў захавання з асабістых збораў Мікалая Красоўскага (у тым ліку матэрыялы часоў Другой сусветнай вайны, узнагароды) перададзены яго сынам, Аляксандрам Красоўскім, у Музей абароны Брэсцкай крэпасці.

Пасля Брэста Мікалай Красоўскі пэўны час працаваў у Мінску загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б, пазней — сакратаром Бабруйскага абкама партыі (да моманту ліквідацыі Бабруйскай вобласці). Далей быў адкліканы ў рэспубліканскія органы кіравання і працаваў загадчыкам аддзела навукі і ВНУ ЦК КПБ. З 1959 года — намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, пасля выхаду на пенсію выкладаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Даследаваў гісторыю вышэйшай адукацыі і абараніў кандыдацкую дысертацыю на гэтую тэму.

### СЯБАР ПІСЬМЕННІКАЎ

На працягу ўсяго жыцця Красоўскі падтрымліваў кантакты з беларускай творчай інтэлігенцыяй (у тым ліку з кампазітарам Несцерам Сакалоўскім, аўтарам музыкі да сучаснага беларускага дзяржаўнага гімна). Доўгі час сябраваў з Петрусём Броўкам, з якім пазнаёміўся яшчэ падчас вучобы ў Полацкім педагагічным тэхнікуме. Асабіста ведаў многіх беларускіх пісьменнікаў, у тым ліку Янку Купалу, Якуба Коласа. Яшчэ ў 1945 годзе народны пісьменнік Беларусі Якуб Колас падарыў Мікалаю Красоўскаму віленскае выданне 1928 года сваёй знакамітай паэмы «Новая зямля» з аўтографам: «Дарагому Мікалаю Ільічу Красоўскаму на памяць ад Якуба Коласа. 8.VII.1945г.». Захаваўся і цёплы аўтограф Петруся Броўкі на сціплай кніжачцы вершаў ваеннага часу: «Міколу Ільлічу Красоўскаму. Старому Полацкаму другу. Пятрусь Броўка. 17.II.44г.».





Быў адданым бібліяфілам. Пачэснае месца ў бібліятэцы Мікалая Красоўскага займала беларуская тэматыка: кнігі класікаў беларускай літаратуры, віленскія часопісы «Маланка», «Летапіс», «Шлях моладзі», культурна-гістарычныя выданні на беларускай, рускай, польскай мовах.

Значным быў збор на тэму партызанскай барацьбы ў гады Другой сусветнай вайны. У тым ліку рукапісныя партызанскія часопісы, падпольныя выданні (лістоўкі, сатырычная газета «Партызанская дубінка», кнігі з паэзіяй змагання). Варта адзначыць і палічку дакументаў ды выданняў, прысвечаных гісторыі Берасцейшчыны.

Але асобнай пільнай увагі заслугоўвае іншая спадчына Мікалая Красоўскага. Мікалай Ільіч пакінуў пасля сябе ўнікальны дакумент эпохі — дзённік часоў Вялікай Айчыннай вайны, запісы ў якім пачынаюцца з 22 чэрвеня 1941 года і завяршаюцца 14 мая 1943 года. Апрача асабістых запісаў, старонкі дзённіка маюць звесткі адносна такіх асоб культуры і гісторыі Беларусі, як Янка Купала, Якуб Колас, Пятро Глебка, Пімен Панчанка, Ілья Гурскі, Анатоль Астрэйка, Цімох Гарбуноў, Алесь Кучар, Панцеляймон Панамарэнка.

Так, у запісе ад 30 красавіка 1942 года гаворыцца: *«Я снова не знаю, что творится с моими котятами (маюцца на ўвазе жонка і дачушка. — **З. Ц.**) и как они живут. Живу надеждой скоро получить хоть «маленькую пісулечку», как говорил Колас. Помнится, когда он говорил про эту пісулечку, Купала, обижаясь на немцев, заявил, что: «Гітлер хацеў зрабіць мне непрыемнасць. Ён назваў маім імем вуліцу Савецкую ў Мінску. Хіба ж гэта не непрыемнасць»?*

На старонках дзённіка раскрываюцца некаторыя абставіны выдання агітацыйнай літаратуры антыфашысцкай скіраванасці, у тым ліку сатырычнай газеты «Партызанская дубінка», лістовак.

Таксама вайсковы дзённік Мікалая Красоўскага мае шмат запісаў, прысвечаных складаным абставінам таго часу.

### УРЫЎКІ З ВАЙСКОВАГА ДЗЁННІКА МІКАЛАЯ КРАСОЎСКАГА

*«26.06.1941: Бабруйск — бомбёжка и паника».*

*«18.10.1941: В поезде. Ночь на сортировочном... Я наверху вагона с боеприпасами. Налёт самолётов. Как сбили самолёт — феерверк. Отъезд из Москвы. Блок-пост».*

*«22.06.1942: Только что получил продукты. Неожиданно и робко ко мне подошла девочка лет 10. Мне почему-то кольнуло в сердце. Я невольно вспомнил свою Томульку. Девочка со слезинкой произнесла: «Дядя!» — и дальше говорить не могла — расплакалась. Когда я ее расспросил, что с ней, она скороговоркой рассказала, что ее папа тоже военный, что они едут 2 недели и что у них нет ни куска хлеба... Мы собрали все, что было у нас в вагонах: хлеба, булок, сахару, печенья и отдали детям, которых множество было в вагонах. Дети! Сколько им пришлось перенести в этой войне! Они вынесли больше, чем взрослые. А сколько их погибло на дорогах от Бреста и Белостока при отходе. Их холодные обезображенные трупы взывают о мщении!»*

*«28.09.1942: «Вечером получили извещение, что ночью 24-го числа немцы, переодевшись партизанами, вместе с полицейскими сняли незаметно часовых и заняли Пудоти (вёска ў Віцебскай вобласці. — **З. Ц.**), перебив часть актива. Это в ту ночь, когда я уехал из Бора и Пудоти. Если бы несколько часов, и кто знает, как повернулась бы фортуна. А может быть и лучше было бы, может хоть чем помог бы»?*

Чытаеш старонкі дзённіка і душой адчуваеш, наколькі яны прасякнуты людскасцю, суперажываннем, жывым чалавечым болем. Таму разумееш словы аднаго з кіраўнікоў Беларусі савецкага часу Ціхана Кісялёва, сказаныя ў красавіку 1982 года пры развітанні назаўсёды з Мікалаем Красоўскім: «Гэта быў вялікі гуманіст! Светлая памяць...»

Арыгіналы дзённіка — а гэта два сшыткі — зараз знаходзяцца ў мяне, і, па ўзгадненні з сынам Мікалая Красоўскага, плануецца перадача гэтага рарытэта ў Беларускі дзяржаўны архіўмузей літаратуры і мастацтва, дзе яго змогуць прачытаць кожны.

**Зміцер ЦІХАНОВІЧ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Концерна «Беллегпром» ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 25 марта 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Лифт грузовой**, г/п 500,0 кг (инв. № 150-5301) | **9 900,00** | 495,00 |
| **2** | **Вагон-рефрижератор холодильник** (инв. № 230-3475). **Условие продажи:** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества, на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние | **15 600,00** | 780,00 |

**Продавец:** Концерн «Беллегпром» ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович. Шаг аукционных торгов – 5 %.

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 22 февраля 2022 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 23 марта 2022 г. в 16.00 включительно.** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части), с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609, **Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by/ в разделе «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в дер. Дуброва (объект 47/2021), дер. Пристромы, ул. Дачная (объект 38/2021), дер. Аношки (объект 69/2020) Озерицко-Слободского сельсовета, Смолевичского района, Минской области

***Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | дер. Дуброва | 624883003801000351 | 0,1500 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 30000 |
